ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 108 (4360)
НЯДЗЕЛЯ, 15 мая 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б—АБ МАСАВАЙ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) і СНК СССР АБ ПЛЯНЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК УРАДЖАЮ 1932 ГОДУ, ЖЫВЁЛАЗАГАТОВАК І ДЭКРЭЦЕ ЎРАДУ САЮЗУ ССР АБ СЕЛЬГАСПАДАТКУ 1932 ГОДУ (1 СТАР.).

АРТЫКУЛ —П. ДЗІТРЫХ—II Інтэрнацыянал і падрыхтоўка інтэрвэнцыі (2 стар.).

Ушчыльненьнем тэрмінаў сяўбы, практычнай работай па разгортваньні калгаснага гандлю,—так адказвае гародна-малочны калгас імя Фалько на пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР (1 стар.).

Польскі фашызм падрыхтоўвае ліквідацыю ТБШ (1 стар.).

Правільная пастаноўка работы партгруп вырашае посьпехі барацьбы за прамфінплян (2 стар.).

Растлумачыць кожнаму рабочаму выгоднасьць трусагадоўлі (2 стар.).

Толькі сацыялістычная сыстэма забясьпечвае нячуваны росквіт навукі і тэхнікі (прамова прэзыдэнта БАН т. Горына на 4 усебел. зьезьдзе ІТС) (3 стар.).

Пяцігадовы юбілей лёўзйскага дзяржтэатру—сьвята новых перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі і росту пралетарскай культуры. (3 стар.).

АБ МАСАВАЙ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) І СНК СССР АБ ПЛЯНЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК УРАДЖАЮ 1932 г., ЖЫВЁЛАЗАГАТОВАК І ДЭКРЭЦЕ УРАДУ САЮЗУ ССР АБ С.-Г. ПАДАТКУ 1932 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. ЦК зварача ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на важнейшае га спадарча-палітычнае значэньне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках і дэкрэце ўраду Саюзу ССР аб сельгаспадатку і прапануе ўсім партыйным арганізацыям па-бальшавіцку разгарнуць шырокае растлумачэньне гэтых пастаноў сярод рабочых, калгасьнікаў, беднякоў, сярэднякоў — аднаасобнікаў, забясьпечыўшы неадкладнае давядзеньне гэтых пастаноў да кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка і сярэдняка.

2. У цэнтры палітычна-масавай і растлумачальнай работы паставіць:

а) узмацненьне тэмпаў разгортваньня сяўбы, барацьбу за ўраджай і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, шырока растлумачыўшы калгасьнікам і аднаасобнікам, што чым з большым посьпехам і ў якасных адносінах лепш будзе праведзена сяўба, тым больш магчымасьцей атрымаюць калгасьнікі, аднаасобнікі (беднякі і сярэднякі) і працоўнае насельніцтва гарадоў палепшыць матар'яльна-бытавое становішча, тым больш магчымасьцей далейшага паляпшэньня рабочага спабжэньня;

б) мабілізацыю ўсёй грамадзкасьці вакол задачы выкананьня загатоўчага пляну і стварэньне насенных фондаў у калгасах у тэрмін;

в) шырокае разгортваньне калгаснага і савецкага гандлю, як асноўнага вагара далейшага паляпшэньня рабочага снабжэньня;

г) шырокае растлумачэньне клясавага характару сельгаспадатку, які праводзіцца савецкай дзяржавай, і падатковых ільгот калгасьнікам, бедняком і сярэдняком.

3. Масава-растлумачальную работу сканцэнтраваць у калгасах, сярод аднаасобнікаў (беднякоў, сярэднякоў), у саўгасах, МТС, прадпрыемствах. Правесьці спэцыяльныя адкрытыя партыйныя сходы з шырокім удзелам кам самольцаў, беспартыйных для прапрацоўкі ўказаных пастаноў.

Адначасова арганізаваць прапрацоўку гэтых пастаноў на ўсіх раённых і калгасных сходах, канфэрэнцыях і г. д., якія адбываюцца ў гэты пэрыяд.

4. Пастановы СНК і ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках і дэкрэт ураду аб сельгаспадатку прапрацаваць ва ўсёй сыстэме партыйнай і камсамольскай асьветы.

Прапанаваць культпропу ЦК у трохдзённы тэрмін распрацаваць і разаслаць у раёны мэтад распрацоўкі і вучэбныя пляны па пытаньнях збожжазагатовак, жывёлазагатовак і адзінага с.-г. падатку.

5. Даручыць т. Некрашэвічу (ДВБ) і т. Серафімаву (БАН) забясьпечыць выданьне масавай папулярнай літаратуры па ўказаных пытаньнях.

Агітмасаваму аддзелу праверыць выкананьне данай пастановы.

6. Прапанаваць усяму цэнтральнаму і раённаму друку разгарнуць шырокае асьвятленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і ўраду аб с.-г. падатку, збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках. Сэктару друку ў двухдзённы тэрмін распрацаваць аперацыйнае заданьне ўсім цэнтральным і раённым газэтам па гэтым пытаньні.

7. ЦК ЛКСМБ у двухдзённы тэрмін даць дырэктыўнае ўказаньне аб распрацоўцы гэтага пытаньня ў камсамольскіх і піянэрскіх арганізацыях.

8. Наркамасьветы ў трохдзённы тэрмін распрацаваць і разаслаць плян прапрацоўкі паказаных пастаноў па ўсёй сетцы культасьветных установаў і масавай школе, адначасова прыступіўшы да неадкладнай прапрацоўкі яго ва ўсіх ВНУ і тэхнікумах.

9. ЦСПСБ даць указаньне па лініі прафарганізацый аб шырокім прыцягненьні да растлумачальнай работы культурных сіл (аграномаў, настаўнікаў і г. д.) і ўключэньні шэфскіх рабочых арганізацый у правядзеньні шырокага растлумачэньня ўказаных пастаноў.

10. Белрадыёцэнтру, пад адказнасьць тав. Шукевіча, арганізаваць перадачу і радыё-пераклічку па гэтым пытаньні.

11. Белдзяржкіно, пад адказнасьць т. Галкіна, арганізаваць папулярызацыю пастаноў партыі і ўраду праз стацыянарнае кіно і наладзіць работу кіно-перасовак непасрэдна на палёх і ў калгасных брыгадах.

Ушчыльненьнем тэрмінаў сяўбы, практычнай работай па разгортваньні калгаснага гандлю,—

так адказвае гародна-малочны калгас імя Фалько на пастановы ЦК і СНК СССР

Узьняць ураджайнасьць, значыць стварыць дадатковыя таварныя рэсурсы для паскарэньня тавараабароту паміж горадам і вёскай

Да ўсіх калгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў-аднаасобнікаў БССР

(Ліст калгасьнікаў калгасу імя Фалько, Грычанскага сельсавету, Менскага раёну)

Прапрацаваўшы на куставых сходах брыгад пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб пляне збожжазагатовак і разгортваньні калгаснага гандлю збожжам, аб пляне жывёлазагатовак і аб мясным гандлі калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак, новы закон аб с.-г. падатку на 1932 год, мы горача вітаем гэтыя пастановы, якія накіраваны выключна на яшчэ большае **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у іх данай арцельнай форме разьвіцьця**, на пасьпяховае выкананьне плянаў апошняга заключнага году першай пяцігодкі, на ўзьняцьце таварнасьці сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, на палепшэньне дабрабыту рабочай клясы, калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў.

Параўнаўшы становішча сялянства ў Савецкай Беларусі і Заходняй Беларусі мы бачым, што там, у фашысцкай Польшчы, галеча, жабрацтва, вялізарныя падаткі, нячуваная эксплёатацыя беларускага працоўнага сялянства, прыдушэньне нацыянальнай культуры. Тут, у нас, у краіне Саветаў, штодзённае палепшэньне матар'яльнага дабрабыту калгаснага сялянства, росквіт беларускай сацыялістычнай культуры, вялізарная творчая актыўнасьць працоўных мас, невялікія падаткі, якія пераважна ідуць на будаўніцтва школ, хат-чытальнь, кіно, ясьлей і інш.

Наш калгас, які посьпіх пазву забітага кулакамі селькора Фалько яднае 174 баднякоў-сярэдняцкія гаспадаркі на зямельнай плошчы ў 1.780 гэкт., Калгас спэцыялізуецца ў гародна-малочным напрамку, мае ўсе ўмовы і магчымасьці для пашырэньня і павышэньня ўвагі таварнасьці, поўнага выкананьня плянаў загатовак, разгортваньня калгаснага гандлю, яшчэ большага забясьпячэньня рабочых г. Менску прадуктамі сельскай гаспадаркі.

У мінулым годзе для малочнай таварнай фэрмы мы пабудавалі скотны двор на 100 шт., цялятнік на 50 шт., сіласную вежу на 300 тон. У гэтым годзе будзем будаваць яшчэ адзін скотны двор на 100 шт., цялятнік — на 100 шт., а таксама прыстасоўваць пэлы рад старых будынкаў для жывёлы МТКФ. Здача малочнай прадукцыі таварнай фэрмы ў мінулым годзе даўнялася 68 проц. ад валавога ўдою. Наша задача ў гэтым годзе — павысіць таварнасьць МТФ з тэй мэтай, каб частку малочнай прадукцыі можна было рэалізаваць праз калгасны гандаль.

Узьняцьце таварнасьці гаспадаркі, а разам з гэтым і стварэньне ўмоў для разгортваньня калгаснага гандлю залежыць перш-на-перш ад поўнага і пасьпяховага выкананьня плянаў весьнавой сяўбы. У адказ на пастановы партыі і ўраду **мы абавязваемся сяўбу яравога кліну ў колькасьці 812 гэкт. закончыць на працягу 25 дзён.** Для атрыманьня лішкаў таварнай прадукцыі высоўваем сустрэчны плян па сяўбе ў колькасьці 28 гэкт. Мы абавязкова засеем: бульбы — 250 гэкт., таварнага гароду — 90 гэкт., ячменю — 50 гэкт., пшаніцы яравой — 30 га, гароху — 40 гэкт.

Для пасьпяховага сканчэньня весняводзкай сяўбы ў вызначаны ўрадам тэрмін, выклікаем на сацспаборніцтва калгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя». Унутры калгасу заключаем сацумовы паміж брыгадамі, групамі і паасобнымі калгасьнікамі. Асноўныя пункты сацдагавароў — лепшая апрацоўка глебы, добры догляд коняй, выкананьне і перавыкананьне норм выпрацоўкі, сваячасовы ўлік працадзён.

Для прэміяваньня лепшых ударнікаў пасеўнай кампаніі, праўленьнем вызначан прэміяльны фонд у суме 500 руб. Ліквідаваўшы абязьлічку, зьнішчыўшы ўраўнілаўку, пры ўкараненьні эльдзельчыны, брыгады даб'юцца выкананьня лёзунгу — **ніводнага гэктара незасеянай плошчы ў вызначаны ўрадам тэрмін.**

У мэтах атрыманьня дадатковай прадукцыі, якую пасьля выкананьня пляну збожжазагатовак магчыма рэалізаваць праз калгасны рынак, дабіцца максымальнага ўзьняцьця ўраджайнасьці. Больш укараняць агратэхнічныя мерапрыемствы, для чаго поўнасьцю пратруціць насеньне, насеяць выключна адсартаваным насеньнем, падабраць лепшыя гатункі, максымальна ўжыць радковы пасеў, скарыстаўшы радковыя сяваркі.

Мы ставім сваёй мэтай дасягнуць з аднаго гэктара ня менш чым 10 цнт. пшаніцы, 14 цнт. ячменю, 10 цнт. аўса, 120 цнт. бульбы, 200 цнт. капусты, 110 цнт. гуркоў, 150 цнт. буракоў, 300 цнт. кораньплодаў і г. д.

Ужыць усе мерапрыемствы для стварэньня моцнай кармовай базы як для МТКФ, так і для жывёлы, якая знаходзіцца ва ўласным карыстаньні калгасьнікаў. Мы ставім перад сабой наступныя канкрэтныя задачы: засеяць кармовых траў—260 гэкт., аўса—215 гэкт., кораньплодаў—30 гэкт., засіласаваць—800 тон. Давесьці сярэдняе - сутачную дачу для аднэй каровы — 13 клгр. кораньплодаў і 13 клгр. сілясу. Давесьці ў 1932 г. пагалоўе буйнай рагатай жывёлы з 210 да 340 шт., пагалоўе сьвіней — з 75 да 200 шт. Давесьці ўдой ад аднэй каровы да 1.300 літраў. Даручыць праўленьню дапамагчы калгасьнікам, якія ня маюць, набыць кароў. Знайсьці дадатковую плошчу для сяўбы кармовых культур, якія пойдуць выключна на забясьпячэньне кормам жывёлы калгасьнікаў.

Для выкананьня плянавых паказальнікаў па МТКФ, замацаваць усіх калгасьнікаў за жывёлагадоўчай брыгадай на цэлы год. Жывёлагадоўчую брыгаду камплектаваць з лепшых ударнікаў-калгасьнікаў. Канчаткова ў брыгадзе зьнішчыць цякучасьць. Шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж скотнікамі і даяркамі, палепшыўшы іх матар'яльна-бытавыя ўмовы.

Мы прыступаем да канкрэтнай работы па разгортваньні калгаснага гандлю. Даручыць праўленьню не пазьней 1 чэрвеня разам з суседнім калгасам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» ў горадзе Менску пры ЗРК мэталістаў адкрыць калгасную краму, якая будзе абслугоўваць рабочых заводу «Камунар» і імя Варапылава. Прасіць райкалгасаюз неадкладна арганізаваць у Менску калгасны рынак. Тут павінна быць менш слоў, больш справы з боку РКС і гарсавету.

Кожная брыгада бярэ на сябе абавязак, выканаўшы пасеўны плян, сваячасова ўбраць ураджай 1932 г. бяз усякіх страт. Мы, калгасьнікі і калгасьніцы, па прыкладу мінулага году, ускладваем усе загады да выкананьня пляну збожжазагатовак да 1-га сьнежня, ссыпкі насенных і страхавых фондаў да 15 студзеня. Даручыць праўленьню скончыць разьмеркаваньне даходаў па працадзнёх за 1932 г. не пазьней 15 студзеня 1933 г.

Выкананьне плян збожжа і мясазагатовак, стварэньне насенных і страхавых фондаў, разьмеркаваньне даходаў па працадзнёх, у нашым калгасе застануцца лішкі таварнай прадукцыі. Улічваючы тое, што калгасны гандаль становіцца важнейшым сродкам паскарэньня тавараабароту і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, **мы абавязваемся праз калгасную краму і калгасны рынак рэалізаваць: бульбы — 3.000 цнт., мяса — 25 цнт., жытняй мукі — 300 цнт., пшанічнай мукі — 20 цнт., круп — 50 цнт., капусты — 400 цнт., гуркоў — 100 цнт., сталовых буракоў — 70 цнт., яблык — 150 цнт.**

Сходы брыгад яшчэ раз падкрэсьліваюць, што толькі выканаўшы свае абавязкі перад дзяржавай, калгас будзе астатнія таварныя лішкі рэалізоўваць праз калгасныя крамы, калгасныя рынкі. Мы будзем даваць самы рашучы адпор кулакам, якія будуць зрываць загатоўчыя пляны, спэкулянтам і перакупшчыкам, якія будуць імкнуцца пажывіцца за лік калгаснага гандлю.

Мы пэрсанальна, сярод кожнага калгасьніка, будзем весьці растлумачальную работу з тым, каб ён лішкі сваёй таварнай прадукцыі, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні, рэалізоўваў праз калгасную краму і калгасны рынак. Будзем весьці нырокую растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, каб яны таксама збывалі лішкі сваёй прадукцыі праз калгасныя крамы, крамы, рынкі.

Пад кіраўніцтвам партыі, яе ленінскага ЦК УсеКП(б) на чале **з тав. Сталіным** пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, у непрымірымай барацьбе з клясавым ворагам — кулакоў і іх агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі, БССР дасягнула вялізарных перамог у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пад кіраўніцтвам партыі, калгаснае сялянства БССР яшчэ больш упарта будзе змагацца за далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Заклікаем усе калгасы, калгасьнікаў і аднаасобнікаў Менскага раёну і ўсёй БССР яшчэ энергічней узяцца за свачасовае выкананьне пасеўных плянаў, стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі, павышэньне ўраджайнасьці, таварнасьці калгасаў і саўгасаў, датэрміновае выкананьне плянаў загатовак.

ЗА ТЭМПЫ, ЗА ЯКАСЬЦЬ ТРЭЦЯЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ, ЗА ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ПА РАЗГОРТВАНЬНІ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ.

Па даручэньні сходу брыгад гэты ліст падпісалі члены праўленьня, брыгадзіры і калгасьнікі-ўдарнікі.

Польскі фашызм падрыхтоўвае ліквідацыю ТБШ

Разгром гурткоў таварыства беларускай школы ў Навагрудчыне і Вільні.—Забарона зьезду таварыства.—Замест зьезду—дэлегаты апынуліся на Лукішках.

Па ўсёй Зах. Беларусі коціцца хваля пратэсту

ВІЛЬНЯ, 14. (Уласная інфарм.). Акупанты распачалі новае наступленьне на беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, які разрастаецца з кожным днём і набывае ўсё больш і больш масавы і рэвалюцыйны характар.

Уся польская буржуазная прэса вядзе правакацыйнае цкаваньне супроць **Таварыства Беларускай Школы**, падрыхтоўваючы грамадзкую думку да поўнай і канчатковай ліквідацыі гэтай адзінай масавай культурна-асьветнай арганізацыі рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

ТБШ налічвае звыш 10.000 членаў і карыстаецца сярод працоўных гораду і вёскі вялікай папулярнасьцю.

Таварыства Беларускай Школы іспавала, наперакор беламу тэрору, адбіваючы на працягу апошніх год усе атакі акупантаў і спробы іх саюзьнікаў—**беларускіх нацыянал-фашыстаў**—пралезьці ў рады арганізацыі з мэтай фашызацыі яе.

Рабоча-сялянскія масы Заходняй Беларусі гарой стаялі за ТБШ, захоўваючы сваю адзіную легальную арганізацыю ў бязьлітаснай барацьбе з ворагам.

Не адважваючыся ліквідаваць ТБШ, фашысцкая дыктатура ўвесь час тэрарызавала яго, не даючы абсалютна ніякай магчымасьці весьці культурна-асьветную працу. **Аб гэтым красамоўна сведчыць хаця-б такі факт, што з 12 акруговых упраў ТБШ засталіся толькі 3—у Беластоку, Косаве і Баранавічах. Рашта ліквідаваны. У адкэй толькі Мірскай акруговай арганізацыі закрыта і разгромлена звыш 30 гурткоў.**

Гэтымі днямі віленская дэфэнзыва разтраміла **гурток ТБШ у Вільні**, які складаўся амаль выключна з **рабочых** заводаў і фабрык. **Кіраўніцтва гуртка і звыш 10 членаў арыштаваны.**

На 12 мая быў назначан агульны зьезд Таварыства Беларускай Школы. **Зьезд забаронен віленскім валводай. Дэлегаты, якія зьехаліся, арыштаваны і пасаджаны на Лукішкі.** У памяшканьні галоўнай управы ТБШ зроблен вобыск. Забраны ўсе матар'ялы і справы.

Забарона зьезду выклікала ў Вільні і па ўсёй Заходняй Беларусі вялікае абурэньне.

Акупанты ліквідуюць апошнія беларускія гімназіі

ВІЛЬНЯ, 14 (УЛАСН. ІНФАРМ.). Побач з наступленьнем на ТБШ, польскі фашызм накладае сваю лапу на міззрныя рэшткі беларускага школьніцтва як ніжэйшага, так і сярэдняга ў акупаванай Заходняй Беларусі.

ПАСЬЛЯ ЗАКРЫЦЬЦЯ ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ НАСТАЎНІЦКАЙ СЭМІНАРЫІ ЎРАД РЫХТУЕЦЦА ЗАКРЫЦЬ ДЗЬВЕ АПОШНІЯ БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ Ў ВІЛЬНІ І НАВАГРУДКУ. Адначасова закрываюцца на правінцыі лічаныя пачатковыя беларускія школы, у тым ліку і прыватныя.

ТАКІМ ЧЫНАМ, БЕЛАПОЛЬСКІЯ АКУПАНТЫ КАНЧАТКОВА І ЦАЛКАМ ЛІКВІДУЮЦЬ УСЁ БЕЛАРУСКАЕ ШКОЛЬНІЦТВА НА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Белхатаве і Беластоку

ВАРШАВА, 11. Да тэкстыльшчыкаў у **Белхатаве** (Лодзінскі раён), якія пачалі забастоўку, далучыліся тэкстыльшчыкі **Беластоку**. Забастоўка абвешчана ў знак пратэсту супроць спроб тэкстыльных фабрыкантаў зьнізіць зарплату на **30 проц.** На адным з буйнейшых лодзінскіх тэкстыльных прадпрыемстваў—«Відзеўскай мануфактуры» выбухнула **італьянская забастоўка супроць пастаяннага затрыманьня зарплаты.** Бастуе каля 1.000 рабочых.

Магутная дэманстрацыя пратэсту рабочых у Вільні

ВІЛЬНЯ, 14. (УЛАСН. ІНФАРМ.). Закрыцьцё Віленскага гуртка ТБШ, забарона зьезду і масавыя арышты дэлегатаў—усё гэта выклікала сярод рабочых Вільні магутную хвалю гневу і абурэньня.

Учора рабочыя масы Вільні НАЛАДЗІЛІ МАСАВУЮ БУРНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ ПАД ЛЁЗУНГАМІ КАМПАНІІ ТБШ. Дэманстранты накіраваліся да школьнага кураторыуму (кіраўніцтва школьнай акругі) і ВЫБІЛІ КАМЕНЬНЯМІ УСЕ ШЫБЫ Ў ПАМЯШКАНЬНІ ГЭТАЙ ФАШЫСЦКАЙ УСТАНОВЫ.

Вялікі атрад паліцыі некалькі раз атакоўваў рабочых, разганяючы і арыштоўваючы іх.

Фінансавае становішча Польшчы пагаршаецца з кожным днём

ВАРШАВА, 10. Чарговая дэкадная справаздача польскага банку сьведчыць аб далейшым пагаршаньні фінансавага становішча Польшчы. Пры зусім мізэрным павялічэньні залатога запасу, фонд замежных валют паменшыўся на **11 з паловай мільёнаў** злотых. Вельмі паказальна, што ў бадзянае адзначана павялічэньне вэксельнага звароту на 29 млн. злотых і рост выпуску банкнот на 90 млн. злотых. Такім чынам, знаходзіць афіцыяльнае пацьвярджэньне факт няўстойлівасьці польскага злотага. Біржа рэагуе далейшым паніжэньнем курсу акцый польскага банку: за апошнія два тыдні ён панізіўся з 85 да 79, а ў апошнія дні — да 72.

Поўны гаспадарчы развал—вось балянс 6-гадовага існаваньня фашысцкай дыктатуры ў Польшчы

ВАРШАВА, 12. Адзначаючы 6-ю гадавіну майскага перавароту, афіцыёз «Газэта польска» ў сёнешняй перадавой піша:

«6 год назад на вуліцах Варшавы разгортаўся бой за будучае Польшчы. Калі-б паралюш і бясьсільле, якія існавалі ў перадмайскі пэрыяд, мелі месца і зараз, дык дзяржава не магла-б адбіць вонкавага націску і дзеянь няў унутраных цэнтрабежных сіл».

Катавіцкая «Пялёнія» ў артыкуле пад загалоўкам «Сумны балянс 6-гадовага існаваньня лагеру маральнага аздараўленьня» зусім інакш ацэньвае 6-гадовыя вынікі. «Успраўленьне дзяржаўнага ладу Польшчы, недахопы якога былі нібы прычынай майскіх падзей,—піша газэта—не прасунуліся ні на крок. Грамадзкая «безнравственность», прадажнасьць, шпіёнаж, марнатраўства ніколі не дасягалі такіх разьмераў, як зараз. Замерлі ўсе прамысловыя прадпрыемствы. Сотні тысяч беспрацоўных дарэмна шукаюць хлеба і працы. Галеча польскай вёскі бязьмежная. Дзяржаўны бюджэт прыносіць дэфіцыт. Таксама дэфіцытны плацёжны балянс краіны. Унутраны рынак збыту параліжаваны. Замежны гандаль скараціўся. Няма ніводнага сьледу давер'я да існуючай сыстэмы сярод польскіх грамадзян, а тым больш загранічцы да Польшчы». У заключэньне газэта заяўляе: «Будучае малюецца ў чорных фарбах. Адбы, вацца пяжкі крызіс маральны, дзяржаўны, палітычны, гаспадарчы і грамадзкі».

Напады беспрацоўных на цягнікі з вугалем

ВАРШАВА, 6. Ня гледзячи на прынятыя меры надзвычайнай аховы чыгунак і снабжэньне зброяй чыгуначнікаў, масавыя напады беспрацоўных на цягнікі з вугалем ня спыняюцца. 3-га красавіка зноў меў месца напад на вугальны цягнік каля станцыі **Бабы** (Лодзінскае ваяводзтва). У нападзе прыняло ўдзел 500 чалавек і вагон вугалю быў поўнасьцю выгружан беспрацоўнымі. Паліцыя праводзіць аблаву ў блізкіх рабочых пасёлках.

ПОЛЬШЧА КАНЦЭНТРУЕ ВОЙСКІ ДЛЯ ЗАХВАТУ ДАНЦЫГУ

БЭРЛІН, 12 (ТАСС). Польшча прадпрыняла новыя эканамічныя рэпрэсіі супроць Данцыгу. Забарона ўвозу ў Польшчу раду тавараў з Данцыгу распаўсюджана і на прадукцыю апрацоўчай прамысловасьці. Апрача таго, забаронен увоз у Польшчу рыбы з Данцыгу, паколькі ўлоў робіцца ня польскімі, а данцыгскімі рыбакамі. «Крэйт пэйтунг» паведамляе, што **польскія ўлады канцэнтруюць у так званым «калідоры» запасную армію, якая складаецца з нацыяналістычных польскіх вайсковых арганізацый, у якія не дапускаюцца прадстаўнікі мясцовых нацыянальных меншасьцей.**

ТЭМПЫ СЯЎБЫ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНУ—УСІМ РАЁНАМ БССР

Плян засеву яравога кліну па БССР выканан толькі на 5,4 проц.

На 5 мая па БССР засеяна **145.540** га яравых, або **5,6 проц.** пляну. Прырост супроць мінулай пяцідзённкі — 2,6 проц. У мінулым годзе на 10 мая было засеяна **3,8 проц.**

Прырост за апошнюю пяцідзённку ўсяго на 2,8 проц. паказвае што, калі ў бліжэйшыя дні ну будзе дасягнута карэннага зруху, дык раньнія тэрміны сяўбы будуць прапушчаны, што значна адаб'ецца на ўраджайнасьці.

На сёнешні дзень з паўднёвых раёнаў толькі адзін **Жыткавіцкі раён** выконвае пляны сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны. **Глускі, Мазырскі, Парыцкі, Тураўскі і Хойніцкі** раёны вядуць сяўбу са спазьненьнем прыблізна на 5-8 дзён. Усе астатнія паўднёвыя раёны прапусьцілі першыя тэрміны і замест таго, каб пачаць сяўбу тэхнічных культур, бульбы і г. д., яшчэ ня скончылі сеяць раньніх яравых. Наогул раёны па паўднёвай зоне выканалі плян толькі на 10,2 проц.

Ня лепш праходзіць сяўба і па раёнах цэнтральнай паўночнай зоны. Першыя выканалі плян на **4,2 проц.** і апошнія — на **1,4 проц.**

Марудныя тэмпы сяўбы ў большасьці раёнаў нічым ня моцуць быць апраўданы. Практыка некаторых раёнаў і калгасаў вызначэньня лепшай сьведкай таго, што ёсьць усе ўмовы для таго, каб пасеўную скончыць у тэрмін.

Узяць-бы хоць такі прыклад, што **Асіпавіцкі, Капыльскі, Слуцкі, Вузьдзенскі і Чырвона-Слабодзкі** раёны цэнтральнай зоны засеялі звыш 10 проц. яравога кліну. У той-жа час **Гомельскі, Бабруйскі, Рэчыцкі, Уваравіцкі і Чачэрскі** раёны паўднёвай зоны не засеялі нават і 5 проц. яравога кліну. Няўжо кліматычныя ўмовы ў цэнтральнай зоне больш спрыяюць сяўбе, чым у паўднёвай зоне.

Апошнія даныя прымушаюць нас сьцьвярджаць, што ў частцы паўднёвых раёнаў пануе стаўка на самацёк, што пытаньні сваячасовага пасеву, як першай умовы высокага ўраджаю, не пастаўлены ў цэнтры ўвагі ўсіх арганізацый.

Задача ўсіх раённых арганізацый—па-баявому ўзяцца за работу. Выкарыстаць усе вагары для паскарэньня тэмпаў сяўбы. Сацспаборніцтва, буксір, працоўная ўзаемадапамога паміж калгасаў і баднякоў-сярэдняцкіх гаспадарак аднаасобнікаў павінны стаць штодзённым мэтадам работы ў полі.

Неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу па папулярызацыі апошніх пастаноў СНК і ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках, закону ўраду аб сельска-гаспадарчым падатку і мабілізаваць калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і шырокія масы беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў на поўнае выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў.

Усякія імкненьні кулака і яго агентаў—апартуністаў, якія імкнуцца затармазіць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай, павінны атрымаць рашучы адпор.

Плян яравога кліну рэальны. Максымум сіл на правядзеньне пасеву ўсіх культур у тэрмін!

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе сяўбы яравых культур па раёнах БССР на 10 мая 1932 г.

НАЗВА РАЁНАЎ	Плян	Засеяна	Проц. выкананьня
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА			
Бабруйскі	56.920	2.659	4,7
Брагінскі	20.850	2.617	12,6
Буда-Кашалёўскі	21.950	1.809	8,2
Веткаўскі	40.300	2.777	6,9
Гомельскі	25.876	1.151	4,4
Глускі	38.240	9.829	25,7
Ельскі	17.160	2.426	14,1
Жлобінскі	42.400	3.983	9,4
Жыткавіцкі	9.060	4.104	45,3
Камарынскі	12,230	1.998	16,3
Кармянскі	37.098	3.189	8,6
Лельчыцкі	13.450	2.458	18,3
Лоеўскі	22.040	2.606	11,8
Любаньскі	20.970	3.210	15,3
Мазырскі	43.750	8.985	20,5
Нараўлянскі	25.500	2.090	8,2
Парыцкі	33.610	8.382	24,9
Пятрыкоўскі	35.650	3.497	9,8
Рагачоўскі	50.590	2.439	4,8
Рэчыцкі	40.468	526	1,3
Старобінскі	22.230	1.756	7,9
Тураўскі	8.200	1.564	19,1
Уваравіцкі	32.049	654	2,0
Чачэрскі	25.099	693	2,8
Церахаўскі	42.580	3.535	8,3
Хойніцкі	21.850	3.513	16,1
Усяго па паўднёвай зоне:	760.120	82.450	10,2
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА			
Асіпавіцкі	22.400	2.403	10,7
Барысаўскі	40.200	1.141	3,5
Быхаўскі	55.255	4.144	7,5
Бягомльскі	20.200	263	1,3
Бялыніцкі	35.530	691	1,9
Бярэзінскі	35.950	1.265	3,5
Горацкі	55.100	1.260	2,3
Заслаўскі	25.500	817	3,2
Касьцюковіцкі	64.500	1.611	2,5
Клімавіцкі	49.700	1.067	2,1
Клічаўскі	32.200	2.606	8,1
Капыльскі	35.450	4.715	13,3
Койданаўскі	47.727	1.769	3,7
Крупскі	40.360	1.015	2,5
Крычаўскі	21.550	790	3,7
Лагойскі	28.270	685	2,4
Магілёўскі	66.970	1.890	2,8
Менскі	50.696	1.209	2,4
Мсьціслаўскі	49.850	1.737	3,5
Плешчаніцкі	23.350	191	0,8
Пражойскі	31.800	1.299	4,1
Пухавіцкі	52.307	2.946	5,6
Слуцкі	43.434	4.886	11,2
Смалявіцкі	37.400	1.684	4,5
Стара-Дарожскі	22.150	1.007	4,5
Талочынскі	54.144	163	0,3
Вузьдзенскі	21.207	2.832	13,4
Чавускі	61.540	1.785	2,9
Чырвонапольскі	31.129	586	1,9
Чырвонаслабодзкі	16.690	1.943	11,6
Чэрвеньскі	28.443	1.673	5,9
Чэрыкаўскі	30.740	1.063	3,5
Шклоўскі	58.936	351	0,6
Усяго па цэнтр. зоне:	1.290.676	53.845	4,2
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
Аршанскі	69.991	1.043	1,5
Асьвейскі	15.437	238	1,5
Бешанковіцкі	42.700	159	0,4
Віцебскі	39.508	361	0,9
Вушацкі	33.450	990	3,0
Гарадоцкі	60.212	288	0,5
Дрысенскі	37.850	98	0,3
Дубровенскі	38.850	709	1,8
Лёзьнянскі	47.400	640	1,4
Лепельскі	40.300	1.050	2,6
Полацкі	48.776	530	1,1
Расонскі	24.750	101	0,4
Сеньненскі	44.107	1.657	3,8
Сіроцінскі	39.800	922	2,3
Сураскі	30.100	124	0,4
Чашніцкі	26.250	335	1,3
Усяго па паўночнай зоне:	638.481	9.245	1,4
Усяго па БССР:	2.689.277	145.540	5,4

**

ПРАВІЛЬНАЯ ПАСТАНОЎКА РАБОТЫ ПАРТГРУП ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХІ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Па-бальшавіцку змагацца за права рапартаваць усебеларускай канфэрэнцыі группарторгаў

Больш году прайшло з часу выданьня Цэнтральным Камітэтам УсеКП(б) пастановы аб перабудове партыйна-масавай работы ў цэху і брыгадзе. Перанясеньне цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў нізавое вытворчае зьвяно, дзе ў канчатковым выніку вырашаецца справа выкананьня прамфінпляну, забясьпечыць канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва з боку партарганізацыі і павышэньне авангарднай ролі камуністаў на вытворчасьці, укараніць на прадпрыемствах прынцыпы адзіначальля, — такая ў асноўным задача высунута гэтай пастановай перад мясцовымі партыйнымі арганізацыямі.

У выкананьне гэтай задачы за мінулы год дасягнуты значныя посьпехі. У тых вытворчых партарганізацыях, дзе па-бальшавіцку рэалізавана пастанова ЦК ад 21 сакавіка 1931 г., дзе праведзена разбуйненьне цэхавых ячэек і правільна пастаўлена работа партгруп, партыйнае кіраўніцтва вытворчым жыцьцём носіць канкрэтны і апэрацыйны характар. Сапраўдны паварот мясцовых партарганізацый тварам да вытворчасьці, павышэньне ў гэтай справе авангардной ролі камуністаў, энэргічная барацьба за поўную рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна адлюстроўваць сабой вытворчыя паказальнікі, пасьпяховае выкананьне прамфінпляну.

На радзе прадпрыемстваў буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР (Гомель, Менск і Віцебск) ёсьць даволі паказальны вопыт у перабудове партработы. Але нельга сказаць, што лепшыя ўзоры работы паасобных партгруп зрабіліся здабыткам большасьці вытворчых партарганізацый. Яшчэ па многіх прадпрыемствах не аддаецца належная ўвага нізавому партзьвяну. У радзе выпадкаў партгрупы ня маюць патрэбнага кіраўніцтва ў сваёй рабоце з боку цэхпарт'ячэек і заводзкіх парткомаў. Невыстарчальна папулярызуецца лепшы вопыт работы партгруп, няма належнай арганізацыі перанясеньня вопыту пасьпяховай барацьбы за прамфінплян у адстаючыя зьвеньні і г. д.

Такое становішча тлумачыцца апартуністычнай недаацэнкай у паасобных зьвеньнях партарганізацый перабудовы партыйна-масавай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, неразуменьнем важнасьці ўмацаваньня і павышэньня ролі нізавога партзьвяна, як палітычнага правадніка ў масах лініі партыі.

У сувязі з гадавінай пастановы ЦК УсеКП(б) аб партыйна-масавай рабоце ў цэху і брыгадзе, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б прыняў пастанову аб шырокім разгортваньні агляду работы нізавых партзьвеньняў. Ня гледзячы на тое, што з часу апублікаваньня гэтай пастановы прайшло каля двух месяцаў, работа ў гэтым напрамку разгортваецца невыстарчальна.

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б у першых чыслах чэрвеня склікаецца **Ўсебеларуская канфэрэнцыя группарторгаў.** Гэту канфэрэнцыю павінна папярэдзіць глыбокае ўсебаковае вывучэньне работы партгруп на вытворчасьці і транспарце з тым, каб перанесьці лепшыя ўзоры работы ва ўсе нізавыя зьвеньні, каб забясьпечыць ужым работы партгруп на вышэйшую ступень, што зьяўляецца неабходнай умовай пасьпяховай барацьбы за выкананьне прамфінпляну чацьвертага, заключнага году першай пяцігодкі.

Пытаньне падрыхтоўкі да ўсебеларускай канфэрэнцыі группарторгаў неабходна зараз прапрацаваць ва ўсіх вытворчых і транспартных партарганізацыях, вызначыўшы канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні і павышэньні ролі нізавых партзьвеньняў, у гаспадарчым і палітычным жыцьці. У правядзеньні падрыхтоўчай работы трэба ўкараніць мэтады сацыялістычнага і ўдарніцтва, па-бальшавіцку змагацца за права рапартаваць канфэрэнцыі канкрэтнымі показальнікамі пасьпяховага выкананьня вытворчых задач.

Свой вопыт перадаем другім

Да студзеня бягучага году ў раскройным цэху **Менскай** абутковай фабрыкі рабочыя да канца месяца ня ведалі, як выконваецца прамфінплян. Вядома, што пры такім становішчы нельга было на-ходу выпраўляць дапушчаныя прабелы.

Са студзеня партыйны калектыў фабрыкі пачаў перабудову сваёй работы. Арганізоўваліся партыйныя групы, партыйна-масавая работа пераносілася ў асноўным у брыгады.

У раскройным цэху арганізаваны 5 партыйных груп.

Перанясеньне цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў нізавое зьвяно зрабіла пэўны пералом у выкананьні прамфінпляну.

Камсамольская брыгада лічылася лепшай брыгадай у раскройным цэху. І ўсё-ж такі ў гэтай брыгадзе прамфінплян недавыконваўся.

У канцы студзеня ў брыгадзе была арганізавана партгрупа. Партыйная група перш за ўсё занялася правільнай расстаноўкай у брыгадзе рабочай сілы. У брыгадзе была значная частка слаба-кваліфікаваных рабочых. Разам з мала-кваліфікаваным рабочым быў пастаўлен добра-кваліфікаваны. Шырока разгорнута масавая работа з аспоўнай устаноўкай на ліквідацыю выпадкаў недавыкананьня прамфінпляну. Дэтальна вывучаліся прычыны вытворчых недахопаў і прымаліся адпаведныя захады для іх зьнішчэньня. Наладжан улік работы як усёй брыгады, так і індывідуальна кожнага рабочага па выкананьні прамфінпляну.

Такім чынам брыгада дабілася ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня прамфінпляну. За люты прамфінплян быў выкананы на 100 проц., за сакавік — па 105 проц. і за красавік — па 103 проц.

Барацьба за прамфінплян праводзіцца мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Сыстэматычна падагульваецца эфэктыўнасьць працы ўсіх удзельнікаў спаборніцтва.

Брыгада мае вялікае дасягненьне і па якасных паказальніках. Нармальна дапускаецца на 60 пар дэталяй тры браку. Брыгада дабілася таго, што на 60 пар дае толькі 1 бракоўную дэталь. У сакавіку з'эканомлена матар'ялу па 10.683 дэцымэтры. Брыгада прад'явіла сацыялістычны рахунак па эканомію іншым брыгадам цэху. Рахунак быў прыняты і цэх з'эканоміў матар'ялаў на 63 тыс. дэцымэтраў.

Гэта брыгада перайшла першай ня толькі ў цэху, але і па фабрыцы, на гаспадарчы разрахунак.

Усе бягучыя вытворчыя пытаньні вырашаюцца трыкутнікам, (группарторг, брыгадзір і прафупаўнаважаны), больш прынцыповыя пытаньні абгаварваюцца на партгрупе, а потым выносяцца на агульны сход брыгады. У брыгадзе рэгулярна праз кожныя тры дні выпускаецца штодзенка.

Кожны партыец групы выконвае пэўную функцыю, за якую ён і адказвае. Напрыклад, ёсьць кіраўнік работай грамадзкіх арганізацый, кіраўнік агітацыйна - масавай работы, рэдактар пасьценгазэты, арганізатар сацспаборніцтва і г. д.

Для дапамогі і перадачы вопыту другім брыгадам вылучаны таварышы.

Вопыт работы партыйнай групы камсамольскай брыгады выкарыстоўваюць партыйныя групы і іншых брыгад цэху. Партгрупа, на чале з групоргам т. Горнам, у якой налічваецца 12 партыйцаў (усяго ў брыгадзе 29 чалавек рабочых) мае такія-ж вытворчыя паказальнікі. Прамфінплян там штомесячна перавыконваецца.

М. С.

Паказальныя рэзультаты

На прыкладзе работы партгрупы 9 брыгады прэсаўшчыкоў другой зьмены Бярэзінскага запалкавага камбінату зусім відавочна, як выкананьне прамфінпляну залежыць ад стану разгортваньня партыйна-масавай работы ў брыгадзе.

У брыгадзе налічваецца 10 рабочых, партгрупа складаецца з 3 членаў партыі.

З часу арганізацыі партгрупы ў брыгадзе прайшло толькі 2 месяцы. Тым ня менш рэзультаты яе работы даволі паказальныя. Калі ў лютым брыгада выканала 82 проц. месячнага заданьня, дык з часу арганізацыі партгрупы, на аснове разгортваньня партыйна - масавай работы, брыгада дабілася перавыкананьня колькасных паказальнікаў і значнага паляпшэньня якасьці прадукцыі. Вытворчая праграма ў брыгадзе за красавік выканана на 101,2 проц.

Партгрупа з пачатку свайго існаваньня пачала весьці рашучую барацьбу за павышэньне працоўнай дысцыпліны, за поўнае зьнішчэньне прагулаў у брыгадзе, шырока ўжываючы мэтады грамадзкай узьдзейчасьці. Вялікую ролю ў гэтай справе адыграла арганізаваная ў брыгадзе штодзенка. Гэтым самым партгрупа дабілася поўнай ліквідацыі прагулаў.

Раней рабочы ў працэсе работы пераходзіў ад аднаго прэса да другога, ня нёс належнай адказнасьці за пэўныя сродкі вытворчасьці. Гэта выклікала паломкі частак у прэсах. Партыйная група рубам паставіла пытаньне перад адміністрацыяй аб ліквідацыі абязьлічкі прэсаў. Зараз у сувязі з ажыцьцяўленьнем гэтага мерапрыемства вышадкі псаваньня зьнішчаны.

У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу «аўладаць тэхнікай», усе рабочыя брыгады ўцягнуты ў тэхнічныя гурткі, акуратна наведваюць заняткі. Вучоба па павышэньні кваліфікацыі рабочых спрыяла ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы. Калі ў лютым было 58,5 машына-гадзін прастою, дык ужо ў сакавіку прастоі зьнізіліся да 32,2 машына-гадзін і г. д.

У брыгадзе рэгулярна праводзяцца вытворчыя нарады, дзе абгаварваюцца недахопы працы і выносяцца канкрэтныя прапановы для іх зьнішчэньня. На апошняй вытворчай нарадзе выклікана на сацспаборніцтва брыгада прэсаўшчыкоў 4-й зьмены на лепшую якасьць прадукцыі і лепшую ачыстку прэсаў.

Побач з гэтымі вытворчымі посьпехамі значна палепшылася бытавое абслугоўваньне рабочых. Устаноўлен належны парадак у сталоўцы. Калі раней частцы рабочых прыходзілася траціць увесь час абедзенага перапынку на атрыманьне абеду, дык па гэту справу зараз уходзіць 15-20 мінут, а астатні час абедзенага перапынку адлаецца чытцы газэт, часопісяй і інш. Усе рабочыя прымаюць актыўны ўдзел у грамадзкай працы. Большасьць іх займаецца палітвучобай, рэгулярна наведваючы палітгурткі.

Пры такой пастаноўцы работы забясьпечваецца поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх паказальніках.

Н.

Работа ячэйкі не адчуваецца

За красавік зьмена т. Ласапёва, **Магілеўскай** швэйнай фабрыкі недавыканала свой прамфінплян на 20 проц. На працягу гэтага месяца ў зьмене было шмат прагулаў, прадукцыя выпускалася дрэннай якасьці, значную частку вырабаў даводзілася перарабляць.

Такое становішча з выкананьнем колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну тлумачыцца перш за ўсё тым, што партыйная ячэйка гэтай зьмены працуе яшчэ па-старыцы, не павярнулася тварам да вытворчасьці, не паставіла ў цэнтры сваёй увагі ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна.

Кіраўнікі ячэйкі да гэтага часу не займаліся пытаньнем перабудовы работы па-новаму, правільнай расстаноўкай партыйных сіл. Сакратар ячэйкі імкнецца вытлумачыць гэта малой колькасьцю камуністаў. Між тым, у ячэйцы налічваецца каля 20 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх большасьць ня мае ніякіх нагрузак.

Амаль нічога ячэйкай ня робіцца ў галіне марксыцка-ленінскага выхаваньня кандыдатаў партыі. Частка з іх ня ўцягнута ў грамадзкую работу.

Значная доля віны за такую пастаноўку работы ў ячэйцы кладзецца на бюро партыйнага калектыву фабрыкі, якое не аддае належнай увагі перабудове партыйна-масавай работы, перанясеньню яе ў нізавое вытворчае зьвяно.

С. Т.

Разгарнулі падрыхтоўку

Сапраўдная перабудова ўсёй партыйнай і масавай работы, перанясень не яе цэнтру цяжару ў цэх і брыгаду дапамаглі партарганізацыі заводу «Бальшавік» узьняць авангардную ролю камуністаў на вытворчасьці.

Зараз у сувязі з падыходзячай гарадзкой канфэрэнцыяй партгруп, партколектыў заводу «Бальшавік» разгарнуў шырокую падрыхтоўчую работу да канфэрэнцыі. Падрыхтоўка праходзіць пад знакам зьнішчэньня тых недахопаў, якія яшчэ маюць месца ў рабоце партыйных груп, пад знакам замацаваньня дасягнутых посьпехаў і далейшага ўзьняцьця ролі партыйных груп на вытворчасьці.

9 мая праведзена нарада группарторганізатараў, якая паказала, што ўсе нізавыя партзьвеньні заводу гатовы па-бальшавіцку змагацца за права рапартаваць заводзкай і агульна-гарадзкой канфэрэнцыі партгруп.

Паміж цэхамі разгортваецца спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да канфэрэнцыі партгруп. Унутры цэхаў разгорнута спаборніцтва паміж партыйнымі групамі за пяршынства ў цэхах.

Уся гэта работа партыйных груп і цэхавых ячэек праходзіць пры канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтве і дапамозе з боку бюро партыйнага калектыву.

Нарада группарторгаў выклікае на спаборніцтва па падрыхтоўцы да гарадзкой канфэрэнцыі партгруп нізавыя партзьвеньні калектыву заводу імя **Варашылава, «Камунар»,** імя **Молатава,** друкарні імя **Сталіна,** фабрыкі **«Кастрычнік»** і **абутковай.**

Шамес.

РАСТЛУМАЧЫЦЬ КОЖНАМУ РАБОЧАМУ ВЫГОДНАСЬЦЬ ТРУСАГАДОЎЛІ

З максымальнай эфэктыўнасьцю выкарыстаць багатую крыніцу дадатковых мясных рэсурсаў

Высокаякаснае мяса—рабочаму спажыўцу

Улічваючы, што трусагадоўля можа ў значнай ступені папоўніць мясныя і тлушчавыя рэсурсы для рабочага забесьпячэньня і асабліва для дыэтычнага харчаваньня, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў прапанаваць Белкаапсаюзу, Белжылсаюзу не пазьней 15 мая распрацаваць плян арганізацыі трусагадоўчых гаспадарак па сваёй сыстэме, а Белкаапхарчу прыступіць да арганізацыі трусатнікаў пры сталоўках з тым, каб мець **пры кожнай сталоўцы трусалік ня менш як на 50 трусаматак.**

Райпрафсаветам запрапанавана на працягу бліжэйшай дэкады арганізаваць нарады па пытаньнях трусагадоўлі ў раёне, мабілізуючы вакол гэтай справы пралетарскую грамадзкасьць.

ЦСПСБ зьвярнуў увагу НКАховы Здароўя, ЦП саюзу мэдсанпрацы, НК Асьветы і ЦП саюзу працасьветы на неабходнасьць разьвіцьця трусагадоўлі пры больніцах, сельскіх школах, дзіцячых дамах, а таксама ўвядзеньня спэцыяльных гутарак у школах аб трусагадоўлі.

Сэктару кадраў прапанавана арганізаваць у рабочых цэнтрах рад курсаў канфэрэнцый і трохмесячных курсаў па трусагадоўлі.



Трусятнік сталовай жанку № 6 Кропіка-матка «Шампань» з Кральчатамі Акроп быў 24 красавіка.

ЦСПСБ лічыць неабходным арганізаваць пры Белкаапсаюзе камітэт садзейнасьці трусагадоўлі з прадстаўнікоў ЦСПСБ, рэдакцыі газ. «Зьвязда», рэд. газ. «Рабочай», Белкаапсаюзу, Белпушніны, Наркамзему, беларускага саюзу паляўнікоў і менскага гарпрафсавету.

Менскаму, віцебскаму, гомельскаму, барысаўскаму, бабруйскаму і полацкаму райпрафсаветам прапанавана арганізаваць выстаўкі па трусагадоўлі.

Пры кожнай сталоўцы—трусагадоўчую гаспадарку

Дырэктар менскага трэсту грамадзкага харчаваньня тав. **Турэцкі** паведаміў аб пэрспэктывах разьвіцьця трусагадоўлі пры прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня.

Як вядома, сталоўкі перажываюць напружанае становішча са снабжэньнем мяснымі прадуктамі. Разьвіцьцё трусагадоўлі—важны сродак у вырашэньні мясной праблемы і паляпшэньні грамадзкага харчаваньня.

Менскі трэст грамадзкага харчаваньня арганізаваў трусагадоўчую гаспадарку на 170 матак. Да канца году лік матак будзе павялічан да 1.000.

Для разьвіцьця трусагадоўлі і стварэньня кармовай базы Менгарсавет адвёў плошчу ў 135 гэкт. Значная частка гэтай плошчы ўжо ў бягучую пасеўную кампанію будзе заселена пад кармовыя культуры, што дасьць магчымасьць забясьпечыць гаспадарку кармамі на 60 проц. Рэшту каркоў прыдзецца набыць за лік самазагатовак і выкарыстаньня розных адкідаў ад грамадзкага харчаваньня.

Трэст ставіць перад сабой мэту, каб пры ўсіх буйных сталоўках арганізаваць трусагадоўчыя гаспадаркі.

Неабходна ў бліжэйшы-ж час вырашыць пытаньне аб сродках для разгортваньня гэтай справы, а таксама забясьпечыць гаспадаркі спэцыялістамі-трусаводамі.

Швэйнікі ўключыліся ў барацьбу за трусячае мяса

Пры ЦП саюзу швэйнікаў Беларусі адбылася нарада работнікаў сацыяльна-бытавых сэктароў фабкомаў швэйных фабрык, ЗРК і прафактыву па пытаньні аб арганізацыі трусагадоўчых гаспадарак.

Нарада прызнала, што разьвіцьцё трусагадоўлі зьяўляецца адным з важнейшых крыніц для паляпшэньня снабжэньня рабочых мясными прадуктамі

Прыняўшы выклік маскоўскага заводу «Серп и молот», нарада абавязалася арганізаваць трусагадоўчыя пункты: пры ЗРК фабрыкі «Кастрычнік»—па 50 матак, сталоўцы фабрыкі—10, ЗРК фабрыкі імя Крупскай—30 і сталоўцы—10, пры сталоўках фабрыкі імя 1 мая—на 10 матак, імя 8 сакавіка—10.

Прыгарадныя гаспадаркі і сталоўкі заключаюць паміж сабой сацдагавары на лепшае разьвядзеньне трусагадоўлі.

Нарада зьвярнулася з адозвай да ўсіх швэйных фабрык, прыгарадных гаспадарак, ЗРК швэйнай прамысловасьці ўключыцца ў барацьбу за мабілізацыю дадатковых мясных рэсурсаў з тым, каб апрача ежы, не пазьней 1 ліпеня арганізаваць у Віцебску, Бабруйску, Магілеве трусагадоўчыя гаспадаркі ня менш, як на 205 матак.

П. Дзітрых

II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ І ПАДРЫХТОЎКА ІНТЭРВЭНЦЫІ

I.

Праблема барацьбы з небясьпекай вайны — гэта для міжнароднага пралетарыяту пытаньне жыцьця і сьмерці. Вайна ставіць пад пагрозу ня толькі матар'яльныя, але і духоўныя заваяваньні міжнароднага пралетарыяту, больш таго — само жыцьцё, само існаваньне мільённых мас працоўных, асабліва ў цяперашнюю эпоху сыстэмы двух сьветаў пагражае грандыёзным дасягненьням сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Здрадніцтва II Інтэрнацыяналу з асаблівай яснасьцю выявілася ў пытаньні аб вайне. Крах II Інтэрнацыяналу выказаўся ня толькі ў арганізацыйным распадзе, але перш за ўсё ў ідэалёгічным банкруцтве, у поўнай перамозе апартунізму. Усе рэзалюцыі, якія абвяшчаюць выкінком II Інтэрнацыяналу і ўсе яго сэкцыі ня толькі да барацьбы супроць вайны, але і да актыўнай процідзейнасьці ў часе вайны, **у рашаючы момант 1914 г. засталіся на паперы.** Над лёзунгам абароны бацькаўшчыны правадыры II Інтэрнацыяналу—усе гэтыя Вандэрвэльдэ, Блюмы, Рэнодэлі, Эбэрты, Шэйдэманы, Гендэрсоны і К° перайшлі ў лягер падпальшчыкаў імпэрыялістычнай вайны, «сталі на бок свайго генэральнага штабу, свайго ўраду і сваёй буржуазіі супроць пралетарыяту». (Ленін). Сацыял-шавінізм сьвяткаваў поўную перамогу.

Пачаўшы сусьветнай бойні II Інтэрнацыянал, верны сваёй традыцыі, стаў зброяй сусьветнага імпэрыялізму ў барацьбе супроць сусьветнага пралетарыяту, супроць Савецкага саюзу, у барацьбе за капіталістычны выхад з сусьветнага эканамічнага крызісу, т. зн. за новую імпэрыялістычную сусьветную вайну.

II.

Вайна японскага імпэрыялізму ў Манчжурыі хавае ў сабе ўсе элемэнты новай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны і зьяўляецца пралёгам да інтэрвэнцыі супроць СССР. Усё гэта ўжо не патрабуе доказаў. Сам буржуазны друк пацьвярджае гэта, адкрыта заяўляючы ўчынак». У рэзультаце атрымаўся крывадушны сацыял-імпэрыялістычны манэўр, які прасьледуе падвойную мэту: з аднаго боку, дэкларацыя павінна «втереть очки» рабочай клясе наконт сапраўднага характару вайны ў Кітаі, а з другога боку, тым самым дакументальна пацьвярджаецца **гатоўнасьць II Інтэрнацыяналу садзейнічаць зўрапэйскім імпэрыялістычным дзяржавам у справе забесьпячэньня іх «благоприобретенных» правоў у Кітаі.**

Пагледзімо, якія «мэтазгодныя сродкі» пры цяперашняй сітуацыі для барацьбы супроць вайны прапануюцца міжнароднаму пралетарыяту правадырамі II Інтэрнацыяналу.

III.

Бюро выканкому II Інтэрнацыяналу зварачаецца да «рабочых усіх краін» з «дэкларацыяй супроць Японіі». Адозва гэта датавана 26 лютага. Яна пачынаецца з устанаўленьня таго факту, што «напад Японіі на Кітай разьвязаў фурый вайны ва Ўсходняй Азіі, і так кваліфікуе пазыцыю вялікіх дзяржаў у пытаньні аб вайне ў Кітаі:

«Пакуль Японія вяла наступленьне ў Манчжурыі, вялікія дзяржавы не прадпрынялі нічога супроць парушэньня Японіяй падпісаных дагавораў, каб прымусіць японскіх драпежнікаў пакінуць процізаконна аку паваную імі кітайскую тэрыторыю».

Гэта заява II Інтэрнацыяналу па адрасе дзяржаў поўнасьцю распаўсюджваецца і на яго самога. Невыпадкова, што і сам II Інтэрнацыянал ні словам не пратэставаў супроць грабежніцкага нападу японскага імпэрыялізму на Манчжурыю. Невыпадкова, што сацыял-дэмакратычны друк зноў падхапіў паклёпніцкі лёзунг аб «савецкім імпэрыялізьме» і ўзмацніў цкаваньне СССР адначасова з узмацненьнем праваакцыйнай палітыкі японскага імпэрыялізму ў адносінах да СССР.

Далей адозва папракае капіталістычныя ўрады ў тым, што яны не адважваюцца ўжыць супроць Японіі сапраўдныя актыўныя сродкі.

Калі супаставіць пазыцыю самога II Інтэрнацыяналу з гэтымі папрэкамі па адрасе капіталістычных урадаў, дык прыходзіцца канстатаваць, што па-першае, II Інтэрнацыянал яшчэ пазьней, чым яны, «прышоў у рух супроць вайны ў Кітаі» (не закранаючы яшчэ тут таго, як II Інтэрнацыянал выступіў супроць вайны ў Кітаі); па-другое, II Інтэрнацыянал таксама, як і капіталістычныя ўрады, не рашаецца ўжыць «актыўныя сродкі» для барацьбы супроць вайны; патрэцце, ваенныя пастаўкі капіталістычных дзяржаў адбываюцца з **санкцыі сацыял-дэмакратычных міністраў і паліцэй-прэзыдэнтаў.**

Раптоўна Ліга нацый зрабілася бясьсільнай у барацьбе супроць вайны,—плачуцца апосталы міру з II Інтэрнацыяналу. А аб тым, што фактычна Ліга нацый падтрымлівала грабежніцкі паход Японіі і ўсяляк ухіляецца ад умяшаньня, прычым усё гэта робіцца **пры падтрыманьні** Гендэрсона, Вандэрвэльдэ, Банкура і г. д.,—аб гэтым у сваёй адозьве «да рабочых усіх краін» правадыры II Інтэрнацыяналу не адважваюцца нічога сказаць.

Пяройдзем цяпер да патрабаваньняў, якія прад'яўляліся II Інтэрнацыяналам да Лігі нацый.

«Пры такім становішчы маральнае абузданьне японскага імпэрыялізму, які пачаў вайну нават без найменшай спробы прыйсьці да згоды мірным трацейскім шляхам, зьяўляецца элемэнтарнейшым абавязкам Лігі нацый».

Мікада і яго афіцэрская камарылья ўжо далі адказ на гэта «абвінчэньне вайны», прытразіўшы выхадам з Лігі нацый. Ды і хто павінен наогул ужываць гэты спосаб «маральнай узьдзейнасьці»? Ліга нацый, г. зн. францускі або брытанскі імпэрыялізм? Па якому праву? Японцы-ж, імкнучыся знайсьці выхад з крызісу, паўтараюць у Кітаі тое, што Францыя даўно тварыла і творыць у Інда-Кітаі, Англія—у Індыі. Супроць імпэрыялізму можа выступаць **толькі** адзін абвінаваўца, гэта—**міжнародны пралетарыят, які адначасова зьяўляецца і абвінаваўцам і судзьдзёй.**

«Мы ведаем,—гаворыцца далей у адозьве,—што вайна на Ўсходзе, дзе сутыкнуліся імпэрыялістычныя інтарэсы ўсіх вялікіх дзяржаў, рэшай або пазьней можа разьвязаць новы сусьветны пажар, што пасьля сусьветнай вайны на Атлянтычным акіяне мы стаім перад пагрозай небясьпекі новай сусьветнай вайны НА ЦІХІМ АКІЯНЕ».

Пагроза новай сусьветнай вайны на Ціхім акіяне—ці ня ёсьць гэта афіцыяльнае паўтарэньне таго, аб чым сацыял-дэмакратычны друк пісаў яшчэ ў пачатку вайны ў далёке Японіі: вайна, моў, далёка, гэта, моў, чыста «япона-кітайская сварка», а нас у Эўропе гэта вайна закранае толькі пастолькі, паколькі наша ваенная індустрыя атрымлівае заказы, дзякуючы гэтаму беспрацоўныя атрымаюць хлеб і работу. Вось сэнс і сутнасьць гэтай фразы аб пагрозе вайны на Ціхім акіяне.

Імпэрыялістычная вайна ў найўнасьці. У Манчжурыі падрыхтоўваецца інтэрвэнцыя супроць СССР. Якія-ж «актуальныя сродкі» прапануе для барацьбы супроць гэтай небясьпекі адозва?

«Таму мы патрабуем раней за ўсё: абвяшчэньня Японіі нападаючым бокам.

Неадкладнага спыненьня ўсіх ваенных паставак і крэдытаў Японіі.

Ужыцьця ўсіх эканамічных і фінансавых сродкаў узьдзейнасьці на Японію, каб прымусіць яе спыніць свой грабежніцкі паход.

Адмаўленьня прызнаньня ўсялякіх японскіх завяваньняў у Кітаі, нават у выпадку «скрепления» іх навязаным Кітаю дагаворам».

Хто-ж павінен праводзіць гэтыя патрабаваньні ў жыцьцё? Зразумела, зноў-такі Ліга нацый. Ці можна прадставіць сабе больш абураючы зьдзек над рабочымі ўсіх краін, чым зварот з гэтымі патрабаваньнямі да Лігі нацый?

Аказваецца, можна. Мы бачым гэта ўжо ў наступных радках адозвы.

«Рабочыя ўсіх краін, прымусьце свае ўрады выканаць гэтыя патрабаваньні, не пацярпеце, каб капіталістычныя ўрады, як суўдзельнікі японскага імпэрыялізму, або з трусасьці садзейнічалі падрыхтоўцы чарговай сусьветнай вайны. Дэманструйце ўсюды супроць японскага і супроць сусьветнага імпэрыялізму.

Далоў імпэрыялізм!

Няхай жыве мір і раззбраеньне».

Што гэта значыць? Тард'е са сваім габінэтам вайны, Макдональд са сваім «нацыянальным» урадам, Брунінг і прэзыдэнт ад вайны Гіндэнбург, Мусаліні і ўсе іншыя—іх трэба прымусіць выканаць гэтыя патрабаваньні. Якім-ж шляхам? Мабыць, такімі-ж хадайніцтвамі і пэтыцыямі, з якімі зварачаліся партыі II Інтэрнацыяналу да капфэрэнцыі па раззбраеньні.

Яшчэ ў адных адносінах вельмі важна тое, аб чым не гаворыцца ў адозьве II Інтэрнацыяналу. Гэта—пытаньне аб ролі сусьветнага імпэрыялізму наогул, францускага імпэрыялізму ў прыватнасьці ў падрыхтоўцы новай сусьветнай бойні. Іменна таму ў адозьве II Інтэрнацыяналу ні словам не ўпамінаецца вэрсальская грабежніцкая сыстэма, якая зьяўляецца пось бітам усіх элемэнтаў новай імпэрыялістычнай вайны.

IV.

За пекалькі дзён да зьяўленьня на сьвет гэтай адозвы генрада ангельскіх прафсаюзаў сумесна з выканкомам лейбарыстскай партыі і яго парламэнцкай фракцыяй апублікавала дэкларацыю адносна становішча на Ўсходзе, якая па тоне і зьмесьце лічым не адрозьніваецца ад адозвы II Інтэрнацыяналу. Дэкларацыя гэта фактычна зьнімае адказнасьць з японскага імпэрыялізму, бо:

«Ваенныя мерапрыемствы былі прадпрыняты на аснове ня вельмі важных учынкаў, за якія пёгка можна было атрымаць поўнае задавальненьне, калі-б Японія выкарыстала поўнасьцю прадугледжаныя Лігай нацый мэтады мірнай згоды».

Значыць, японцы, праўда, памыліліся ў выбары сродкаў, але ўсё-ж повадам да ваенных дзеяньняў зьявіліся падзеі ў Кітаі.

У другім месцы тэй-жа дэкларацыі паўтараецца і нават падкрэсьліваецца гэты тэзіс:

«Палітычныя непаладкі ў Кітаі не апраўдваюць уварваньня чужаземнай сілы на кітайскую тэрыторыю».

І тут таксама падкрэсьліваецца факт палітычнай разрухі ў Кітаі, а не разбойніцкі налёт японскага імпэрыялізму. Далей дэкларацыя канстатуе, што «ангельскі ўрад праводзіў палітыку шчырага і дружнага супрацоўніцтва з новым Кітаем», і падкрэсьлівае, што ўжо ў 1928 г. урад заявіў, што

«Усе дзяржавы павінны адмовіцца ад думкі, нібы эканамічнае і палітычнае разьвіцьцё Кітаю можа быць забясьпечана толькі апекай з боку, і што яны павінны прабаваць праводзіць палітыку гармоніі ва ўзаемаадносінах з Кітаем».

Гэта палітыка,—гаворыцца далей у адозьве,—праводзілася пасьпяхова, і таму лейбарыстскія правадыры рэкамэндуюць японскаму імпэрыялізму «замяніць сваю палітыку гвалту ў адносінах да Кітаю палітыкай прыязнага супрацоўніцтва».

Гэта прапанова ангельскіх лейбарыстаў нішто іншае, як новае выданьне старой ангельскай калёнізатарскай палітыкі, якая ў процілегласьць калёніяльнай палітыцы Францыі і Галяндыі, прытрымліваецца прынцыпаў паказальнага лібэралізму, на справе-ж па сваіх мэтах і мэтадах жорсткага прыгнечаньня зусім не адстае ад палітыкі францускага імпэрыялізму.

Такім чынам гэта адозва накіравана толькі супроць грубых мэтадаў калёнізатарскай палітыкі японскага імпэрыялізму і, апрача таго, мае яшчэ па мэце дабіцца згоды Японіі з Англіяй адносна падзелу Кітаю. Тым самым лейбарыстскія правадыры становяцца **простымі адвакатамі ангельскага імпэрыялізму.**

Пазыцыя сацыял-фашысцкіх лідэраў у пытаньні аб вайне ў Кітаі ні ў найменшай ступені не адрозьніваецца ад ганебнай ролі сацыял-шавіністаў у 1914 г. і тады, у 1914 г. с.-д. правадыры II Інтэрнацыяналу да апошняй мінуты не пераставалі выступаць з дэкларацыямі супроць вайны, у якіх яны, як і зараз, канстатавалі, што гэта вайна будзе імпэрыялістычнай, захопніцкай вайной, што яна будзе накіравана супроць інтарэсаў рабочай клясы і што кроў мільёнаў рабочых праллецца ў гэтай вайне за чужую ім справу. Гэта была апошняя даніна гэтых партый даваеннаму інтэрнацыяналу.

Актуальны і разам з тым надзвычай павучальны і наглядны прыклад далі нам германскія сацыял-дэмакраты, выступіўшы на выбарах за кандыдату ру прэзыдэнта вайны Гіндэнбурга. Той факт, што сацыял-фашысцкім лідэрам удалося мабілізаваць шырокія масы с.-д. выбаршчыкаў на падтрыманьне Гіндэнбурга, сыгналізуе зараз, у момант, калі насоўваецца сусьветная імпэрыялістычная вайна, вялікую і сур'ёзную небясьпеку.

Ва ўмовах цяперашняй сітуацыі праблема вайны зьяўляецца цэнтральнай. У цэнтры ўсёй рэвалюцыйнай масавай работы павінна таму стаць барацьба супроць вайны. Маркс, Энгельс, Ленін вучылі нас, як змагацца супроць вайны. Гэтыя ўрокі павінны стаць здабыткам усёй рабочай клясы і ўсіх працоўных пластоў насельніцтва.

IV усебеларускі зьезд ІТС

Толькі сацыялістычная сыстэма забясьпечвае нячуваны росквіт навукі і тэхнікі

Прамова прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук тав. П. ГОРЫНА

Дазвольце мне ад імя Беларускай Акадэміі Навук вітаць IV усебеларускі зьезд інжынэрна - тэхнічных работнікаў і выказаць упэўненасьць, што ў далейшым паміж Акадэміяй Навук і інжынэрна-тэхнічнымі кадрамі будзе ўстаноўлена неабходная цесная сувязь. Я думаю, гэта пажаданьне ня можа быць простай дэкларацыяй.

Задачы, што магла паставіць толькі пралетарская рэвалюцыя

Бурныя тэмпы разьвіцьця нашай навукі і тэхнікі патрабуюць самага дружнага адзінства работнікаў Акадэміі і інжынэрна-тэхнічных кадраў. Разрыў паміж Акадэміяй і інжынэрна-тэхнічнымі кадрамі асабліва недапушчальны ў сучасны пэрыяд, калі бурны рост сацыялізму забясьпечвае ўступленьне ў наласу найвялікшых навуковых адкрыцьцяў і тэхнічных дасягненьняў.

Што наша сацыялістычная сыстэма дала магутны штуршок разьвіцьцю навуковай і тэхнічнай мысьлі — гэта зараз зусім відавочна. Перад намі паставлен цэлы рад праблем, якія пяводьна вырашыць капіталістычная сыстэма. Узяць, напрыклад, такія праблемы, як устаноўку адзінай усесаюзнай высокавольтавай электрычнай сеткі, пабудову магутных заводзкіх гігантаў, буйных саўгасаў і г. д. Гэтыя задачы магла паставіць толькі пралетарская рэвалюцыя.

Да некаторай ступені напрошваецца гістарычная паралель з рэвалюцыяй пачатку XIX стагодзьдзя, якая ў свой час дала штуршок разьвіцьцю тэхнічнай мысьлі. Як усякая гістарычная паралель, зразумела, яна вельмі ўмоўная, патрабуе ўліку і разуменьня тых розных задач, што стаялі ў канцы XVIII і пачатку XIX стагодзьдзяў у часе буржуазнай рэвалюцыі і ў XX стагодзьдзі — у часе нашай рэвалюцыі, як пралетарскай, сацыялістычнай.

Тэхнічная рэвалюцыя канца XVIII і пачатку XIX стагодзьдзя цясьнейшым чынам была зьвязана з палітычнай рэвалюцыяй і зьнішчэньнем фэадальных адносін. Падобна да таго, як у канцы XVIII і пачатку XIX стагодзьдзя ўжываньне паравой машыны Д. Уайта, прадзільнай машыны Харкгрэўса і Крамптона, чаўнака — Кея і механічнага варштату Картрайта было немагчыма пры наяўнасьці фэадальных адносін, таксама для сучасных тэхнічных дасягненьняў у галіне электрычнасьці, хэміі, авіяцыі і г. д. капіталістычная сыстэма зьяўляецца зьлейшым ворагам, які скоўвае далейшае разьвіцьцё навукова - тэхнічнай мысьлі. Гэта добра адчуваюць на сабе многія вучоныя, інжынэры і тэхнікі, якія жывуць у капіталістычных краінах.

Ня дзіва, што сярод замежнай прагрэсыўнай тэхнічнай інтэлігенцыі з кожным днём растуць сымпатыі да Савецкага саюзу. Яна наглядна пераконваецца, што сацыялізм — сапраўдная рэальнасьць, якая забясьпечвае разьвяволеньне чалавецтва ад капіталістычнай эксплёатацыі. Яна бачыць, як наш сацыяльна-палітычны лад, дыяметральна - процілеглы капіталістычнаму, адкрывае перад навукай і тэхнікай нябывалыя кругавіды і магчымасьці. Напрыклад, пабудова такіх гігантаў, як Дняпрабуд, Кузьнецкабуд, Сталінградзкі трактарны завод і г. д., зусім немагчыма ў сучасных капіталістычных дзяржавах. Як вядома, Дняпрабуд зьяўляецца самай магутнай гідраэлектрастанцыяй у сьвеце.

Капіталістычны лад—скоўвае разьвіцьцё тэхнікі

Заграніцай для шырокіх пралетарскіх мас і тэхнічнай інтэлігенцыі з кожным днём становіцца ўсё больш відавочным, што капіталізм ня ў стане скарыстаць навейшых тэхнічных дасягненьняў, што ў гістарычны пэрыяд, які намі перажываецца, прадукцыйныя сілы ўступілі ў рэзкі канфлікт з сацыяльна-палітычным ладам капіталізму, выхадам з якога зьяўляецца толькі пралетарская рэвалюцыя. Гэтыя супярэчнасьці адчуваюцца, літаральна, на кожным кроку, выліваючыся часамі ў зьявішчы зусім, здавалася-бы, незразумелыя чалавечаму розуму. Напрыклад, у краіне, дзе пшаніцай топяць печы, адзін беспрацоўны зьвярнуўся да дырэктара цырку з прапановай прадаць сябе на публічнае разарваньне тыграм, каб выратаваць ад галоднай сьмерці сваю сям'ю. Усім вам добра відомы факты зьнішчэньня ў Амэрыцы вялізарных запасаў кавы, або выдатныя праекты амэрыканскага ўрада аб абавязковым скарачэньні пасеўных плошчаў у той час, як мільёны людзей літаральна галадаюць.

У пошуках выхаду з тупіку, які стварыўся, трацяць галовы нават людзі, якія пядаўна прэтэндавалі на годнасьць «прагрэсыўных элемэнтаў». Напрыклад, чаго варта прапанова Жоржа Дзюамэля забараніць усякія вынаходзтвы на пяць год. Ён мімаволі нагадвае абзывалых абатаў, якія «скалісьці паравую машыну лічылі «исчадием ада». Жорж Дзюамэль далёка ня так арыгінальны ў сваёй прапанове. Яго пэны — буржуазія — ужо даўно практычна рэалізуюць гэты «плян» і скупляюць патэнты вынаходцаў для таго, каб іх ніхто ня ведаў і каб яны, як мерцьвякі, ляжалі ў сэйфах трэстаў і банкаў.

Я думаю, сусьветная пралетарская рэвалюцыя адкрые перад намі цэлы рад гатовых важнейшых навуковых адкрыцьцяў, аб якіх буржуазія, купіўшы аўтараў гэтых адкрыцьцяў, забараніла сказаць хоць адно слова. Усё гэта, вядома, нам дзіка чуць. Але гэта факт, бо на зямной кулі мы маем дзьве сыстэмы. У той час, як у капіталістычных краінах ужываюцца ўсе меры, каб затрымаць разьвіцьцё навуковай і тэхнічнай мысьлі, мы, наадварот, змагаемся за кожнае наша вынаходзтва. Толькі наша сацыялістычная сыстэма магла выкліканць нячуваны ўзлёт навукова - тэхнічнай

мысьлі, масавую зацікаўленасьць у тэхніцы, якая ўжо выявілася ў трыста тысячах вынаходзтваў у СССР, зарэгістраваных на сёньняшні дзень у бюро вынаходзтваў. Пры гэтым характэрна, што галоўная маса вынаходцаў—рабочыя і сяляне.

Новы тып вучонага і спэцыяліста

Калі мы гаворым аб набліжэньні эпохі новых адкрыцьцяў і тэхнічных дасягненьняў, мы нямінуча павінны мець на ўвазе, што актыўным ўдзельнікам гэтай эпохі можа быць толькі **новы тып вучонага і тэхніка.** Пралетарская рэвалюцыя востра паставіла пытаньне аб новым вучоным, зусім розным ад вучонага эпохі капіталізму. У той час, як капіталізму патрэбен вучоны па сваіх ведах і слуга капіталу па сваім становішчу, нам неабходны палітычна - сьвядомы інжынэр і тэхнік, сьвядомы будаўнік сацыялізму, які ўмее зразумець значэньне сваёй работы ў справе барацьбы за зьнішчэньне эксплёатацыі чалавека чалавекам. Як вядома, буржуазія сьвядома імкнулася кастрыраваць палітычнае пачуцьцё інжынэраў. Са школьнай лаўкі яна цьвердзіла, што палітыка і тэхніка — гэта розныя рэчы і ў гэтым быў яе мэтад выхаваньня сваіх інжынэрна-тэхнічных кадраў.

Для нас такая сыстэма зусім не падыходзіць. Падобна да таго, як мы можам пасьпяхова спраўляцца з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, толькі маючы кадры сьвядомых рабочых, таксама мы павінны мець палітычна-сьвядомых і адданых справе пралетарыяту інжынэраў і тэхнікаў. На гэты бок у свой час зварачалі ўвагу заснавальнікі навуковага сацыялізму Маркс і Энгельс, адзначаючы, што ва ўмовах сацыялізму навука становіцца новай прадукцыйнай сілай. Вядома таксама з якой увагай Маркс і Энгельс сачылі за разьвіцьцём прыродазнаўчых навук і дасягненьнямі тэхнікі. Па-мойму, гэты бок дзейнасьці Маркса і Энгельса павінен заслужыць асаблівай увагі, таксама як і тое, што найвялікшыя вучоныя ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук маглі даць свае каштоўныя адкрыцьці выключна таму, што ўважліва сачылі за разьвіцьцём філёзофскай, эканамічнай і гістарычнай мысьлі. Возьмеце, напрыклад, такіх вучоных-прыродазнаўцаў, як Лявуазье, Карно, Дарвін і інш. Я думаю, што нашы вучоныя і інжынэры, якія хочуць быць сьвядомымі будаўнікамі сацыялізму, хочуць упісаць сваю старонку ў гісторыю падыходзячых адкрыцьцяў і вынаходзтваў, выкананць гэта змогуць толькі спалучаючы ў сабе вялізарныя веды ў галіне сучасных марксыцка-сацыяльных навук з глыбокімі ведамі па сваёй вузкай спэцыяльнасьці.

Па-бальшавіцку асвоіць замежную тэхніку

Калі гавораць, што мы павінны аўладаць дасягненьнямі тэхнічна - перадавых капіталістычных краін, дык гэта зусім ня значыць, што мы павінны вывучыць толькі колькасную суму ведаў. Асваеньне дасягненьняў заходнеэўрапэйскай і амэрыканскай тэхнікі павінна весьціся па-бальшавіцку, т. зн. неабходна мець на ўвазе ня толькі колькасны бок, але і якасны, т. зн. уменьне скарыстаць тэхнічныя дасягненьні ў нашай сацыялістычнай сыстэме. Можна было-б прывесьці цэлы рад прыкладаў, калі буйныя заходнеэўрапэйскія і амэрыканскія інжынэры аказваліся бездапаможнымі ў нашых умовах. Яны пры тым часта аказваліся бездапаможнымі таму, што наша сыстэма высоўвае цэлы рад праблем, якіх ня ў стане паставіць капіталістычная сыстэма. Вядома, напрыклад, якое замяшаньне праявіў буйнейшы амэрыканскі спэцыяліст у галіне сельскай гаспадаркі Кемпбэль, траціўшы ў наш збожжасаўгас «Гігант». Гэта сьведчыць аб тым, што мы павінны мець, не гаворачы аб якасным баку, больш кваліфікаваныя, больш ведаючыя кадры. **Вось чаму перад намі, як актуальная задача, стаіць штодзённае павышэньне нашых ведаў.** Гэта неабходная ўмова каб пераганяць перадавыя ў тэхнічных адносінах капіталістычныя краіны. У гэтых адносінах для нас можа служыць прыкладам малады 28-гадовы савецкі інжынэр тав. Захараў, які змантаваў пядаўна Бярэзьнікаўскую ЦЭЦ, самую магутную ў сьвеце, вывучаць якую цяпер едуць да нас замежныя інжынэры і тэхнікі. Тав. Захараў не адзінокі. Можна было-б назваць яшчэ многа слаўных прозьвішчаў нашых савецкіх інжынэраў, якія ў сілу таго, што спалучаюць у сабе якасьці спэцыяліста і бальшавіка, упарта асвойваюць і ўмела крытычна пераапрацоўваюць дасягненьні замежнай тэхнікі—даюць узоры, якім павінен быць і што можа даць савецкі інжынэр.

Калі мы гаворым аб нашай тэхнічнай рэвалюцыі, я хацеў-бы адзначыць адзін надзвычай істотны момант, які павінен прыцягваць пастаянную ўвагу інжынэрна-тэхнічных сіл. Гэта—**пытаньне аб хутчэйшай рэалізацыі нашых тэхнічных дасягненьняў.** Па-мойму, мы мала гаворым аб гэтым. Мы маем цэлы рад буйнейшых адкрыцьцяў і вынаходзтваў, якія часта злачынна доўга залежваюцца ў нашых установах, у той час, як іх рэалізацыя ў практыцы сацыялістычнага будаўніцтва дала-б нам вялікія рэзультаты. Мне думаецца, што барацьба **за хутчэйшую рэалізацыю нашых адкрыцьцяў, вынаходзтваў і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў павінна быць аднэй з галоўных задач інжынэрна-тэхнічных сэкцый. Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што злачынства перад справай будаўніцтва сацыялізму робіць той, хто сьвядома ці несьвядома адцягвае тэрмін практычнай рэалізацыі нашых вынаходзтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў.**

Выкарчоўваць рэшткі некультурнасьці

Пытаньне аб тэхнічнай рэвалюцыі, з другога боку, цесна зьвязана з нашай **барацьбой за культурную рэвалюцыю.** Выступіўшы перада мною таварыш прывёў прыклад, як на аднэй цагельні з-за няўважлівых адносін да машыны **была сарвана** вытворчая праграма. Аб выпадках нагардлівых адносін да машын маглі-б расказаць многія з прысутных. Я думаю, нам трэба ўскрыць асноўную прычыну гэтага зьявішча. Для ўсіх бясспрэчна, што асноўная прычына—гэта некультурныя адносіны да машыны. Мы ня справімся з задачамі індустрыялізацыі краіны, калі нашы машыны будуць хутка выбываць са строю. Паглядзеце, як часта мы натлядаем нагардлівыя адносіны да трактара, аўтамабіля, або варштату. Усё гэта прымушае нас разгарнуць шырокую кампанію па ўкараненьні любасьці да машыны, бярэжлівых, культурных адносін да яе, па самой рашучай барацьбе з абязьлічкай у карыстаньні абсталяваньнем (пашпартызацыя машыны, прэміяваньне за добры догляд іх і г. д.).

Ленін невыпадкова у сваіх апошніх артыкулах аддаваў выключную ўвагу барацьбе за культурную рэвалюцыю, бо гэта ёсьць барацьба за сацыялізм. Мы ня можам да барацьбы за культурнасьць падыходзіць ведамствопна, бо гэта, моў, справа Наркамасьветы, або культурных установаў. У гэту барацьбу павінны быць уцягнуты шырокія масы і ў першых радох сярод іх павінны знаходзіцца інжынэрна-тэхнічныя кадры. Пры гэтым неабходна памятаць, што барацьба за культурную рэвалюцыю ня можа абмяжоўвацца «дэкаднікам» або «месячнікам». Патрабуецца ўпартая, штодзённая, штогадзінная праца па выкарчоўваньні рэштак некультурнасьці, гэтага небясьпечнага ворага сацыялістычнага будаўніцтва. Змаганьне гэта надзвычай цяжкае. У кожным з нас ёсьць яшчэ многа абломаўшчыны і коснасьці. Паглядзеце, як часта мы барбарскі адносімся да нашага часу і трацім яго злачынна перацынкальна. Прыкладаў нашай некультурнасьці можна падаць сотні з кожнай галіны нашай работы. Іменна гэта акалічнасьць патрабуе ад нас настойлівасьці і ўпартасьці ў барацьбе з рэшткамі некультурнасьці, што, як праўда, западта прыліпаюць да нас і тармозяць наша разьвіцьцё.

Таварышы, мінулыя гады рэвалюцыі характарызуюцца вялізарнымі перамогамі пралетарыяту. Наперадзе яшчэ вялікія посьпехі, вялікія перамогі. Што-ж забясьпечвае заваяваньне гэтых посьпехаў? Яны сталі магчымымі выключна таму, **што мы маем камуністычную партыю, Ленінскі ЦК УсеКП(б) на чале з т. Сталіным, якая, дзякуючы бязьлітаснай барацьбе з апартунізмам, з найменшымі адхіленьнямі ад ленінскай лініі, забясьпечыла правільнае кіраўніцтва масамі.** Правільнае партыйнае кіраўніцтва—аснова і нашага далейшага сацыялістычнага разьвіцьця. Толькі пад кіраўніцтвам партыі нашы інжынэрна-тэхнічныя кадры могуць быць актыўнымі будаўнікамі сацыялізму, **толькі кіраўніцтва камуністычнай партыі забясьпечвае нячуванае ў гісторыі разьвіцьцё навукі і тэхнікі. (Воплескі)**

ПЯЦІГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ЯЎРЭЙСКАГА ДЗЯРЖТЭАТРУ—

сьвята новых перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі і росту пралетарскай культуры

Бальшавіцкае прывітаньне ЯДзТБ!

Прывітаньне ЯДзТ ад ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б шле бальшавіцкае прывітаньне калектыву і кіраўнікам Бел. Дзярж. яўрэйскага тэатру ў сувязі з пяцігодзьдзем яго працы.

Народжаны ў выніку пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі, БДзЯТ зьяўляецца значным фактарам у галіне правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, у галіне мабілізацыі яўрэйскіх працоўных мас на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, зьяўляецца моцнай зброяй інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных.

Задачы калектыву тэатру — барацьба за далейшае ўзьняцьце ідэйна-мастацкага ўзроўню сваёй творчай работы, узмацненьне штодзённай сувязі з шырокай пралетарскай грамадзкасьцю, мабілізацыя тэатральнага мастацтва нацыянальнага па форме, сацыялістычнага па зьместу, на вырашэньне задач ліквідацыі перажыткаў капіталізму ў сьвядомасьці людзей, на паказ сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

ЦК КП(б)Б.

ДЗЯРЖАЎНАМУ ЯЎРЭЙСКАМУ ТЭАТРУ БССР

Прэзыдыум ЦВК БССР горача вітае Дзяржаўны яўрэйскі тэатр Беларусі з яго пяцігадовым юбілеем. Толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, рабочыя і ўсе працоўныя яўрэі, на аснове поўнай роўнасьці ўсіх народаў, атрымалі магчымасьць разьвіваць сваю культуру—нацыянальную па форме і пралетарскую па зьместу. Стварэньне і работа Дзяржаўнага яўрэйскага тэатру Беларусі маюць вялізарнае палітычнае і культурнае значэньне і зьяўляюцца адными з важнейшых мерапрыемстваў кампартыі і савецкай улады ў галіне ленінскага вырашэньня нацпытаньня. Дзяржаўны яўрэйскі тэатр Беларусі паказаў на справе, што ён умее змагацца за ўзьняцьце культурнасьці, за ўзмацненьне ўдзелу працоўных у сацыялістычным будаўніцтве. Тэатр вядзе вялікую інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу, мабілізуючы працоўныя масы яўрэйства на актыўны ўдзел у барацьбе за поўную пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Прэзыдыум ЦВК БССР выказвае ўпэўненасьць, што працаўнікі Дзяржаўнага яўрэйскага тэатру БССР, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, будуць і надалей пасьпяхова змагацца за разьвіцьцё мастацтва, вартага нашай вялікай эпохі.

Няхай жыве і мацнее інтэрнацыянальнае яднаньне працоўных усіх нацыянальнасьцяй!

Няхай жыве правадыр працоўных—камуністычная партыя!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Прывітаньне Наркамасьветы—ЯДзТ

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр зьяўляецца адным з лепшых паказальнікаў тых перамог, якія рабочая кляса БССР атрымала пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў выніку пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Калегія Народнага Камісарыяту Асьветы БССР у дзень пяцігадовага юбілею горача вітае калектыў ДЯТ і яго кіраўнікоў.

Узмацняйце тэмпы і якасьць сваёй працы, уздымайце сваю ідэалёгічна-мастацкую ўзброенасьць, каб хутчэй паставіць работу тэатру на ўзровень і інш. грамадзкіх і культурных арганоў задач, якія паставіла партыя перад мастацтвам на парозе другой пяцігодкі.

Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве мастацтва на службе сацыялізму!

Народны Камісарыят Асьветы БССР.

***

У рэдакцыю паступілі прывітаньні Яўрэйскаму Дзяржаўнаму тэатру БССР ад ЦК ЛКСМБ, ЦП працмастацтва, 3-га Беларускага дзяржаўнага тэатру і інш. грамадзкіх і культурных арганоў задач, якія паставіла партыя нізацый.

«Ботвін» (пастаноўшчык М. Ф. Рафальскі). Сцэна—«на кватэры ў Ботвіна». Зьлева направа акторы: Б. НОРД (Вальцэр), М. АЛЬТМАН (Мірыам Ботвін), К. Рутштэйн (Цэхноўскі), М. МОІН (Ботвін).

ТЭАТР НА ФРОНЦЕ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ

(Гутарка з мастацкім кіраўніком ЯДзТ, заслужаным артыстам рэспублікі—тав. РАФАЛЬСКІМ)

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, заваяваў моцныя пазыцыі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Ён імкнецца пранізаць усю сваю работу зьместам клясавай барацьбы, вялікай мастацкасьцю, арганізуючы гледача на пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва, пасьпяховае завяршэньне апошняга году першай пяцігодкі і вырашэньне вялікіх гістарычных задач другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

За час свайго існаваньня ЯДзТ пабываў у гастрольных паездках па гарадох УССР і РСФСР. Гарачы прыём, які быў аказан тэатру на Ўкраіне і ў Маскве паказаў, што яўрэйскі дзяржтэатр набыў усесаюзнае значэньне. Ён заняў адно з першых месц на ўсесаюзнай алімпіядзе мастацтва.

Тэатрам праводзілася і праводзіцца вялікая грамадзкая работа. Пры тэатры створаны тры агітмастацкія брыгады, у тым ліку адна камсамольская, якія ва ўсіх гарадох, дзе толькі тэатр бываў, па ўсіх прадпрыемствах, у часе абедзеных перапынкаў на мясцовым матар'яле арганізоўваюць выступленьні і гэтым дапамагаюць прадпрыемствам у справе выкананьня прамфінпляну, выкрыцьця ўсякіх недахопаў, іляжэўдарнікаў, лятуноў, рвачоў і г. д. За адзін толькі 1931 год і пачатак 1932 году агітбрыгадамі арганізавана каля 50 выступленьняў. Вось што піша, напрыклад, адзін рабочы гомельскай швэйнай фабрыкі «Камінтэрн» тав. **Эпштэйн:**

«Тэатр па матар'ялах нашай фабрыкі паставіў інсцэніроўку, якая была паказана ў часе абедзенага перапынку. Інсцэніроўка выкрыла іляжэўдарнікаў, прагульшчыкаў і выклікала значны зрух у рабоце ў бок паляпшэньня яе якасьці».

Такіх вялізарных посьпехаў Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР дасягнуў толькі пад кіраўніцтвам партыі, дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, на аснове агульнага росту сацыялізму і культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

Задача тэатру моцнымі мастацкімі вобразамі паказваць са сцэны новага чалавека-будаўніка сацыялістычнага грамадзтва, чалавека-энтузіяста і, наадварот, бязьлітасна выкрываць і выручваць усё варожае пралетарыяту, усё старое, гнілое.

У сьвятле гэтых задач пытаньне аб акторы і яго ролі ў тэатры, становіцца кардынальным пытаньнем для тэатру. Толькі кваліфікацыя актора, яго марксыцка - ленінскае выхаваньне

Заслужаны артыст рэспублікі, мастацкі кіраўнік ЯДзТ БССР т. М. Ф. Рафальскі.

могуць быць гарантыяй вырашэньня гэтых задач.

Пэрспэктывы далейшай работы нашага тэатру ўпіраюцца, з аднаго боку, у рост савецкай драматургіі і, з другога боку, зьвязаны з ростам акторскіх сіл і аўладаньнем імі марксыцка-ленінскім сьветапоглядам.

Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК мы гістарычныя задачы і абавязкі, ускладзеныя на наш тэатр, з посьпехам выканаем. (БелТА).

Быць у першых радох барацьбітоў за сацыялістычную культуру

Беларуская Акадэмія Навук з глыбокай радасьцю адзначае такі буйны факт у культурным і нацыянальным разьвіцьці Савецкай Беларусі, як пяцігодзьдзе Дзяржаўнага яўрэйскага тэатру БССР. Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам КП(б)Б, у барацьбе за культурную рэвалюцыю, як неабходную ўмову посьпехаў нашага далейшага сацыялістычнага будаўніцтва, Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР яшчэ шырэй разгорне сваю работу, будзе ў першых радох барацьбітоў за сацыялістычную культуру, будзе заражаць масы энтузіязмам для нашых далейшых перамог, будзе рашуча змагацца з буржуазна-нацыяналістычнымі перажыткамі, за інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук П. ГОРЫН.

За 1,5 млн. тон добраякаснага торфу

Торфазаводы „Закрашынскі мох" і „Чырвоная Беларусь"

канкрэтнымі самаабавязацельствамі адказваюць на ліст Асінторфу

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ

9-10 МАЯ	Двухдзённае заданьне—4527 тон Здабыта—1160 „	Процант выкан. 25,9

Ударная работа на балоце—адказ на выклік

На заклік Асінторфу, мы, рабочыя і ІТР заводу **«Закрашынскі мох»** (Рэчыцкі раён), адказваем шырокім разгортваньнем торфаздабычы. На 10-га мая наш завод здабыў ужо больш 300 тон. Работа праводзіцца ў тры зьмены. Асобныя брыгады давялі сваю выпрацоўку амаль да поўнай нормы. Так, камсамольская брыгада тав. **Буйневіча,** якая першая распачала сэзон, 9 мая за 8 гадзін выпрацавала 32 тыс. цаглін, што складае 97,3 проц. заданьня. Брыгады т. т. **Дзергачова** Сяргея і **Дзергачова** Івана, прыбыўшыя на завод 4 мая ў поўным складзе, таксама ўжо наблізіліся да поўнай выпрацоўкі сваіх заданьняў.

Мы давялі да кожнай брыгады вытворчыя заданьні на поўны сэзон. Праведзена вытворчая канферэнцыя ўсіх рабочых, на якой высунут **сустрэчны; ён павялічвае вытворчую праграму заводу з 15 да 17 тыс. тон,** па машына-фармовачнай здабычы, з 2 да 3 тыс. тон — па ручной.

У мінулым годзе наш завод выканаў свой прамфінплян звыш 100 проц., за што атрымаў усесаюзную прэмію. Такой ударнай работы мы дабіліся шляхам правільнай расстаноўкі рабочай сілы на машынах і брыгадах, шырокага разгортваньня сацыялістычных форм працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, добрага культурна - бытавога абслугоўваньня рабочых.

Сёлета мы таксама добра падрыхтаваліся да сэзону. Усе рабочыя размешчаны ў **чыстых, асьветленых электрычнасьцю бараках.** Наладжана грамадзкае харчаваньне. Завод мае сваю хлебапякарню, сьвінную фэрму, якая снабжае рабочых мясам. Каб яшчэ больш наладзіць культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых, мы абавязваемся ў паралку ўдарнай работы ня пазьней 20 мая скончыць абсталяваньне **пабудаванай вялікай лазьні,** арганізаваць дзіцячыя ясьлі.

Усё гэта дасьць нам магчымасьць ліквідаваць цякучасьць рабочых, замацаваць іх да канца сэзону.

У мэтах узмацненьня тэмпаў нашай работы, якія-б поўнасьцю забясьпечылі выкананьне і перавыкананьне пляну, мы абавязваемся шырока разгарнуць масавую работу сярод рабочых, арганізаваць пераход брыгад на вышэйшыя формы сацпаборніцтва — гаспадарчы разрахунак, ахапіць усіх рабочых вучобай у палітшколах і розных гуртках.

Па даручэньні калектыву заводу:

Дырэктар заводу — ВЫРВІЧ.
Сакратар парт'ячэйкі — МІГДАЛОВІЧ.
Старшыня тарфкому — ГЕЛЬФАНД.
Тэхкіраўнік заводу — МІНІН.
Брыгадзіры: БЫЧКОЎ, ПРАЦЬКО, ДЗЕРГАЧОЎ І., ДЗЕРГАЧОЎ С., БУЙНЕВІЧ, КАВАЛЕЎСКІ.

Высоўваем сустрэчны ў 8 тысяч тон

Таварышы рабочыя, ІТР і служачыя Асінторфу! Наш завод «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» (Быхаўскі раён) распачаў торфаздабычу 7 мая, на два дні пазьней тэрміну. На 10 мая намі ўжо здабыта каля 100 тон торфу, але першыя дні нашай работы паказалі, што мы далёка невыстарчальна падрыхтаваліся да сэзону. Аб гэтым сьведчыць хаця-б той факт, што двухдзённае заданьне (9 і 10 мая) намі выканана ўсяго на 26,6 проц. Паводле пляну, торфаздабыча павінна была распачацца з 5 мая, а ў нас на сёньняшні дзень пушчана ў эксплёатацыю толькі палова машын.

Гэта нас абавязвае зараз, калі сэзон ужо распачаўся, разгарнуць такія ўдарныя тэмпы работы, каб усе недахопы і прабелы, дапушчаныя ў часе падрыхтоўкі, былі-б выпраўлены на-ходу, каб наш завод у бліжэйшыя дні вышаў у перадавую калёну ўдарнікаў торфяных палёў.

У адказ на ваш заклік мы бярэм наступныя самаабавязацельствы:

— Шляхам шырокага разгортваньня сацыялістычных форм працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва—правільнай расстаноўкі рабочай сілы і тэхнічных кадраў на машынах, вучастках і брыгадах, дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну торфаздабычы, ПАВЯЛІЧЫЎШЫ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ, У ПАРАДКУ СУСТРЭЧНАГА, З 42 ТЫС. ДА 50 ТЫС. ТОН.

— У мэтах паляпшэньня якасьці торфу правільна арганізаваць работу брыгад-тарфяніц, занятых на сушцы, ДАВЕЎШЫ ВІЛЬГОТНАСЬЦЬ ТОРФУ НЯ ВЫШЭЙ 30 ПРОЦ.

Мы адчуваем недахоп у тарфянніках. Каб забясьпечыць бесьперабойную работу машын ў тры зьмены, мы ўцягваем у брыгады жанчын-тарфяніц, а таксама АРГАНІЗУЕМ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ ЖАНОЧУЮ БРЫГАДУ, якая ў поўным складзе будзе працаваць на машыне.

Для паляпшэньня культурна - бытавога абслугоўваньня рабочых, мы СТВАРЭНЬНЕМ ПРАЛЬНЮ для мыцьця бялізны тарфянікаў.

Бяручы на сябе гэтыя абавязкі, мы выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых, ІТР і служачых торфзаводу ГРЭБЯНЕВА, МАГІЛЕЎСКАГА РАЁНУ і просім у бліжэйшы-ж час даць адказ на наш заклік.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых, ІТР і служачых заводу:
Дырэктар заводу—ВІТАЛЕЎ.
Сакратар парт'ячэйкі — ПУЗЫРЭЎСКІ.
Старшыня тарфкому—МЕЛЕХАЎ.
Бюро ІТС — БАНАХ.

НА ЗДЫМКУ: Уносўарганізаваная хозрахунковая брыгада тарфянога балоту «Марково-Зборное» (Іваново-вознесенск. обл.) абгаварваюць сустрэчны плян.

ФРАНЦУСКАЯ АХРАНКА Б'Е АДБОЙ

Стаўка на „агента Камінтэрну" біта

ПАРЫЖ, 12. На ўчарайшым допыце ў следчага Гаргулаў прызнаўся ў тым, што служыў у белых арміях. Ён заявіў: **«Я служыў пад камандай генэрала Ляхава і заставаўся ў радох белагвардзейскіх вайсковых часьцей да 1919 году. Я прымаў удзел у баёх супроць бальшавікоў у Армавіры, Стаўропалі і Грузіі.** Потым я вучыўся ў Растове-на-Дану.

«Адзін час, — сказаў ён на допыце, —я задумляў аб забойстве Леніна, але, на жаль, я ня мог папасьці ў Маскву. **У студзені 1932 г. я парашыў забіць савецкага пасла ў Парыжы.** Я адправіўся на вуліцу Грэнэль (дзе зьмяшчаецца савецкае паўпрэдзтва), маючы намер прасіць савецкага пасла даць мне віну на праезд у Расію. Я ніякаў сваё імя і ўказаў, што выяўляюся старшынёй нацыянальнай рускай партыі, пры гэтым я захапіў з сабой **рэвальвэр.** Я ня быў, аднак, вырашыт пасломм, і таму, што яго ня ведаў асабіста, дык я пазбаўлен быў магчымасьці яго забіць».

Гаргулаў заявіў, што ён ніколі не варочаўся ў СССР. «Я ня мог бы туды паехаць, — сказаў ён, — **бо савецкі ўрад прыгаварыў-бы мяне да сьмерці.**

Гэта заява Гаргулава канчаткова выкрывае ўсю бязглуздасьць правака цыйных паведамленьняў паліцыі аб яго «сувязях з СССР».

Парыская паліцыя замешана ў забойстве Думэра

ПАРЫЖ. Новыя падрабязнасьці забойства Думэра белагвардыцтам Гаргулавым, якія зараз высьвятляюцца, неабвержна сьведчаць аб тым, што ў забойстве францускага прэзыдэнта замешана паліцыя.

Падазроны выгляд Гаргулава з такой відавочнасьцю кідаўся ў вочы, **што зварачаў на сябе ўвагу прыватных наведвальнікаў «Выстаўкі кнігі».** Толькі агенты паліцыі, якімі, згодна паведамленьня друку, было поўна памяшканьне «Выстаўкі кнігі» ўхітраліся **«не прымячаць»** Гаргулава. Між тым, ён, пасьля яго-ж указаньня, **наведаў выстаўку яшчэ напярэдадні забойства, г. зн. да не адкрыцьця, каб «вывучыць» месца будучага злачынства, а ў дзень забойства зьявіўся на выстаўцы за гадзіну да прыезду прэзыдэнта.** Усё гэта вельмі нагадвае забойства старшыні рады міністраў царскай Расіі Стальпіна ў 1911 г. ахранікам Багровым, які прыйшоў у тэатр, дзе быў забіт Стальпін, па палітычнай варшцы.

Нават, калі прыватныя асобы, як, напрыклад, жонка пісьменьніка Клода Фарэра, спэцыяльна ўказвалі на «Юманітэ» працяжнае свае выкрыцьці і пішна: «Мы атрымалі в пусіем пэўных крыніц паведамленьне, якое кідае яркае сьвятло на ўсю гэту брудную авантысавецкую кампанію. Вечарам у той самы дзень, калі адбылося забойства Думэра, адзін з буйнейшых органаў друку паведаміў на аснове прызнаньняў Гаргулава, што апошні зьяўляецца рускім фашыстам. **Гард'е выклікаў у міністэрства замежных спраў журналіста, адказнага за гэта правільнае паведамленьне, вылаяў яго і ЗАГАДАЎ СВАЁЙ ПРЭСЕ АБВЕРГНУЦЬ ГЭТА «ПРЫКРАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ» і ПІСАЦЬ, БЫЦЦАМ ЗЛАЧЫНЕЦ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў СУВЯЗІ З КАМУНІСТАМІ.**

Гард'е меў надзею нажыць капітал на замаху, зробленым белагвардзейцам, правакатарам, які знаходзіцца на службе ў Кіяпа, Гішара, у ахранкі, але ён ня мог уніяняць сушярэчнасьцей паміж першай і другой версіямі».

Скампраметаваная прэфэктура апублікавала цяпер новае камунікэ наступнага зьместу: «Паліцыя, якая дакладна расьсьледвала дзейнасьць Гаргулава ў Манака перад яго ад'ездам у Парыж, лічыць, што ён дзейнічаў адзін і яго замах зьяўляецца актам ізаляванай асобы». Такім чынам, **ПАЛІЦЫЯ ЎЖО АДМОВІЛАСЯ АД ВЭРСІІ, БЫЦЦАМ ГАРГУЛАЎ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АГЕНТАМ ДПУ.** («Правда»).

Парыская паліцыя замешана ў забойстве Думэра

чальніку паліцыі Гішару на падазроньня паводзіны Гаргулава, паліцыя ўпарта працягвала яго ігнараваць.

Самы характар сьледзтва па справе аб забойстве Думэра выклікае **СУР'ЁЗНЫЯ ПАДАЗРЭНЬНІ.** Так, чамадан, Гаргулава, пакінуты ім, згодна паведамленьня **«Эко дэ Парыж»** на Люксэмбургскім вакзале, да гэтага часу быццам ня **ЯНЧЭ НЯ ЎСКРЫТ.** Яго думаюць адкрыць толькі на судзе. **Ці ня ясна, што за гэты час з чамадану можна забраць усё непажаданае і пакласьці туды што хочаце?**

Такія мэтады сьледзтва паказваюць, што паліцыйны будуць выкарыстаны ўсе мэтады правакацыі і ўсе спосабы, каб замесьці сьляды.

Яшчэ адзін правал ахранкі

ПАРЫЖ, 13. Як паведамляе францускі друк, Гаргулаў па ўчарайшым допыце заявіў: « У 1926 г. я атрымаў годнасьць доктара ў Празе. Аднак, я ня мог забыць аб маёй бацькаўшчыне і павінен быў весьці барацьбу супроць бальшавікоў». Газэты паведамляюць, што ў часе допыту Гаргулава сьледчы зрабіў вочную стаўку паміж Гаргулавым і эмігрантам Казлоўскім, які заявіў, што «Гаргулаў езьдзіў у 1927 годзе ў Расію і вярнуўся адтуль з вялікімі грашыма». **Гаргулаў рашуча абзёрг цьверджаньне Казлоўскага, гаворачы, што «гэта было - б немагчымым, бо савецкі ўрад прыгаварыў -бы яго да сьмерці».** Што - ж датычыць паходжаньня грошай у яго, дык Гаргулаў паўтарыў сваё ранейшае паказаньне, што ён атрымаў іх «ад адной старой дамы». Далей Гаргулаў заявіў, што яго «запісы» ў запісной кніжцы адпавядаюць сапраўднасьці. «Я ўсё запісаў, — сказаў Гаргулаў, — каб ацягаціць сябе злачынствамі і дабіцца хутчэйшай сьмяротнай кары».

Правакацыя Гаргулава— „сумны прабел" у паліцэйскіх правілах

ПАРЫЖ, 12. (ТАСС). «Тан» разглядае Гаргулава, «як неўраўнаважанага чалавека, які горшы за вар'ята, бо немагчыма іх усіх «ізаляваць». «Тан» адзначае, што на ўсіх гарадох Францыі блукае маса такіх людзей, у рэзультаце складзеных сацыяльных умоў. Газэта мяркуе прынамсі абараніцца ад іх шляхам устанаўленьня больш суровых правіл нашэньня і пабыцьця зброі для чужаземцаў. «Тан» падкрэсьлівае: «Некаторыя газэты шукаюць у трагічнай сьмерці Думэра складаных эўранэйскіх матываў. Ці не прасьцей было - б адрозьніць тут спачатку вынікі сумнага прабелу ў паліцэйскіх правілах». «Тан» заклікае будучую палату дэпутатаў, шляхам належных законаў, «абараніць будучых кіраўнікоў Францыі ад дурацкага гневу некаторых асоб». «Калі палата дэпутатаў гэтага ня зробіць, — падкрэсьлівае «Тан», —дык яна возьме на сябе адказнасьць за падобныя фатальныя злачынствы, якія могуць паўтарыцца».

Ламаньнем касьцей прымушаюць фашыста Гаргулава называцца бальшавіком

БЭРЛІН, 11-V. (ТАСС) «Вольт ам-абенд» паведамляе, што Гаргулаў вярнуўся з паліцэйскага допыту са **зламанай рукой.** Яму быццам заявілі, што калі ён назаве сябе бальшавіком, дык абыходжаньні з ім неадкладна будуць палепшаны. На запытаньне карэспандэнта ТАССС, рэдакцыя «Вольт ам-абэнд» заявіла, што вышэйуказаны факт не праверан.

НАНКІНСКІ ДРУК ПРЫЗНАЕ ПАГУБНАСЬЦЬ РАЗРЫВУ ЗНОСІН З СССР

ШАНХАЙ, 12. (ТАСС) Кіруючая кітайская газэта «Шунь-Бао» прысьвячае тры перадавіцы аб адчаўленьні зносін з СССР. У перадавым артыкуле, апублікаваным сёньня, газэта піша: «Разрыў зносін быў пагубным крокам. Адчаўленьне зносін становіцца настойліва неабходным. Відавочна Нанкін разумее гэта, бо Ловень-Кань выказаў падобнага роду погляд і нанкінскі ўрад дазволіў агенцтву ТАСС перадаваць гэта паведамленьне з Кітаю. Гэта паказвае, што нанкінскі перадаць гэта паведамленьне з СССР. Мы можам спадзявацца, што неабходныя крокі хутка будуць прадпрыняты. Газэты ўказваюць на прыклад Германіі і Турцыі, якія падтрымліваюць прыяцельскія зносіны з СССР, значна ўмацавалі сваё міжнароднае становішча». «Яны,—піша газэта—не баяліся «пагрозы камунізму», бо існаваньне і распаўсюджваньне камунізму ня выклікана існаваньнем СССР. У прыватнасьці, што датычыць Кітая, нясумненна, што існаваньне ў ім камунізму выклікана палітычнымі і сацыяльнымі прычынамі. Разрыў зносін і забарона нават успаміналь аб СССР ня дасьць ніякіх рэзультатаў. Толькі палітычнае адраджэньне або сацыяльная ўстойлівасьць папярэдзяць выбух рэвалюцыі. Пара пакласьці канец блізарукай палітыцы».

Новыя японскія часьці ідуць у Манчжурыю

ТОКІЁ, 12 (ТАСС). «Ніцы-ніцы» ў перадавым артыкуле заяўляе, што японскі ўрад паступае правільна, адпраўляючы папаўненьні ў Манчжурыю. Газэта ў сваіх довадах спасылаецца на тое, што «даклад камісіі Літона прызнае, што 50.000 былых салдат арміі Чжан Сюэ-ляна абярнуліся ў бандытаў». «Далей,—піша газэта,—камісія Літона таксама прызнала, што ў Паўночнай Манчжурыі, апрача манчжурскага ўраду, няма ніякай кітайскай улады, і манчжурскі ўрад аказвае дапамогу Японіі ў справе забесьпячэньня японскіх правоў і інтарэсаў. Таму, улічваючы жаданьне манчжурскага народу, Японія павінна накіраваць новыя папаўненьні ў Паўночную Манчжурыю».

Кар'ера пана Тард'е

ПАРЫЖ, 12 мая. Тард'е «рвет и мечет». Правал інсьпіраваны ім газэтнай кампаніі аб суўдзеле забойцы прэзыдэнта Думэра ў Камінтэрне—у наяўнасьці. Наёмная банда прадажных журналістаў з рэдакцыяй «вялікага» друку вымушана набраць вады ў рот у той час, як выкрыцьці «Юманітэ» аб сувязі белагвардзейскіх забойцаў з самымі адкрытымі колямі францускага імпэрыялізму і саюзьнікаў апошняга ў Празе, у Варшаве, на Балканах і ў пімітрофах адгукваюцца гулкім рэхам аплявух на ўвесь сьвет.

Цёмная гісторыя з забойствам на «Выстаўцы кнігі» і роля высокапастаўленых элемэнтаў кіруючай францускай фінансавай алігархіі атрымліваюць раптоўнае асьвятленьне пры азнаямленьні з мінулым пана Тард'е, з тым зьвілістым шляхам, які прывёў яго да верхавіны кар'еры—пасады прэм'ера і фактычнага кіраўніка замежнай палітыкі Францыі, палітыкі, у цэнтры якой стаіць пытаньне аб антысавецкай інтэрвэнцыі.

Андрэ Тард'е звыш трох дзесяцігодзьдзяў займаецца журналістыкай, прадстаўляючы сабой адну з буйнейшых фігур так званай «рэвальвэрнай» прэсы, якая спэцыялізавалася на шантажах, вымаганьствах і падлогах. З 1904-1917 г. г. Тард'е пад псэўданімам Жоржа Вільэ загадвае замежным аддзелам «Тан»—газэты, якую ў Францыі характэризуюць: «ТАН» НЕ ГАЗЭТА, А ДОМ РАСПУСТЫ» (ВОДГУК ЖАНА ДЗЮПЮІ, УЛАСЬНІКА «ПЦІ ПАРЫЗЬЕН»). «Тан» адначасова зьяўляецца афіцыёзам і францускага ўраду, і пейборгэнам вядомага купмэтнага фабрыканта, старшыні «Комітэт дэ форж» дэ-Вэндэля. Зусім нядаўна, пасьля сьмерці дырэктара «Тан»—Мілля, выявілася, што рашэчны пакет акцый газэты належыць дэ-Вэндэлю.

Адзін францускі карыкатурыст яшчэ ў 1907 годзе намалёўваў карыкатуру на Тард'е, паказваючы, як ён пярхам на вялізарнай чарнільніцы імкнецца наперад. Подпіс газэрыў: «Я ЗРАБЛЮ КАР'ЕРУ».

Якімі шляхамі прышоў да мільённага багацьця Тард'е, як дабіўся ён цяперашняга становішча, якое забясьпечвае яму славу, становішча і новыя, новыя грошы?

Спэкулянт буйнага размаху, павец у мутнай вадзе, Тард'е-Вільэ зьявязаў сваё імя з двума экзатычнікамі назвамі: «ХОМС-БАГДАД» і «НГОКО-САНГО». Аб гэтых гісторыях у свой час падрабязна пісалі Пэсеай у «КУР'ЕР ЭРОПЭЕН» і Морызэ ў «ЮМАНІТЭ». Аб іх варта ўспомніць.

Паміж Хомсам і Багдадам зьбіраліся пабудаваць чыгунку. Тард'е, у кампаніі з нейкім Маймонам, потым асуджаным на катаргу за шпіёнаж у карысьць Германіі, прабаваў аказаць націск на турэцкі ўрад для атрыманьня гэтай канцэсіі. Стаўка была на атрыманьне ПАСАДЫ СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕНЬНЯ ГЭТАЙ ЧЫГУНКІ (гэта зьвязана з шырокімі кругавідамі спэкуляцыі), а таксама на скромны куртаж У 1 МЛН. ЗАЛАТЫХ ФРАНКАЎ. Султанская Турцыя адносілася да хадайніцтваў Тард'е, які дзейнічаў ад імя раду банкаў, даволі стрымана. Тады Тард'е адкрыў надзвычай жорстокую кампанію супроць турэцкага ўраду ў сваім газэтным прытоне «Тан». Але справа сарвалася. ТУРЭЦКІ ДРУК ВЫКРЫЎ СУВЯЗЬ ТАРД'Е З КАТАРЖНІКАМ І ШПІЁНАМ МАЙМОНАМ, апублікаваў адпаведную перапіску. Устаноўлена было таксама, што СУЛТАНСКІЯ ЎЛАДЫ ЗАПЛАЦІЛІ ТАРД'Е 30.000 ФРАНКАЎ ЗА ЯГО ГРАМАВЫЯ АРТЫКУЛЫ СУПРОЦЬ МЛАДАТУРАК.

Яшчэ больш цынічна справа «Нгоко-Санго», аб якой камуністычныя дэпутаты парляманту не забываюць напомніць Тард'е кожны раз, калі ён і яго партыя дапускаюць нахабныя выхадкі супроць рэвалюцыйнага рабочага руху або выпады супроць Савецкага саюзу.

«Нгоко-Санго»—гэта пустынная вобласьць ў Заходняй Афрыцы, захопленая францускімі імпэрыялістамі. Гэту вобласьць Тард'е намецiў для арганізацыі шэчуковых плянтацый. Краіна была настолькі прасякнута мясцамі трапічнай ліхаманкі, што ніколі ні адзін акцыянэр не адважыўся-б у яе зазірнуць. Тард'е прад'явіў францускаму ўраду, які складаўся з ЯГО-Ж ПРЫЯЦЕЛЯЎ, іск аб рэпарацыях за быццамбы панесеныя страты. Урад выплаціў яму, на таргуючыся, ДВА МІЛЬЁНЫ ФРАНКАЎ.

Аўтар і галоўны рэдактар взарсальскага дагавору, няўмольны прыхільнік і глашатай палітыкі бязьлітаснага абграбленьня германскіх працоўных, Тард'е мае ў сваім мінулым некаторыя моманты, якія ВЫКРЫВАЮЦЬ ЯГО НЯ СТОЛЬКІ Ў ФРАНЦУСКІМ, КОЛЬКІ Ў ГЕРМАНСКІМ «ПАТРЫЯТЫЗЬМЕ». У 1907 годзе на зьезьдзе францускіх і нямецкіх журналістаў у Парыжы Тард'е быў самым заядлым абаронцаю зблізканьня паміж Германіяй і Францыяй. Гэта ідэалёгічная надбудова мела, як заўсёды, эканамічны базіс. Якраз у гэты час ТАРД'Е ХАДАЙНІЧАЎ АБ ЗАСНАВАНЬНІ «ФРАНКА-ГЕРМАНСКАГА ТАВАРЫСТВА Ў КОНГО» З ПЕРАВАЖАНЬНЕМ ГЕРМАНСКАГА КАПІТАЛУ. Агадзірскі інцыдэнт парушыў гэтыя пляны. Золак вайны паміж Францыяй і Германіяй, які зьявіўся прадвесьнікам сусьветнай бойні 1914-1918 г. г., сарваў намбінацыі Тард'е. Ён быў ВЫКРЫТ, пачаўся СУДОВАЕ СЬЛЕДЗТВА, і толькі дзякуючы моцным сувязям ён зноў выйшаў сухім з вады.

Партрэт Тард'е для сваёй паўнаты і прыгожасьці адчуває яшчэ патрэбу ў тым, каб напомніць яго паходжаньні ў Злучаных Штатах у 1916 годзе, калі ён зрабіў туды агітацыйную паездку на зопата Шнэйдэра-Крэзо і іншых каралёў ваенная прамысловасьці, з мэтай апрацаваць грамадзкую думку ПАЗШ, якія рыхтаваліся да ўступленьня ў вайну. Ён арганізаваў у Вашынгтоне бюро прапаганды са штатам у 60 журналістаў, прамоўцаў і мастакоў, з пелшых супрацоўнікаў францускай ахранкі і найбольш разбэшчаных бульварных пісак.

Таленты і заслугі Тард'е не прапалі дарма. Біржа ўзьнесла яго на буйнейшую камандную пасаду, адкуль Тард'е-Вільэ на працягу доўгіх гадоў, займаючы пасады ад міністра да прэм'ера, дырыжаваў падрыхтоўкай антысавецкай інтэрвэнцыі.

Шырока задуманы грандыёзны трук з Гаргулавым прадракаў бліскучыя перспэктывы назвычайнай на маштаб антысавецкай кампаніі, павінен быў зьявіцца НЕЛАСРЭДНАЙ ПРАЛЮДЫЯЙ ДА ІНТЭРВЭНЦЫІ. Трук праваліўся. Аўтар яго выкрыт.

Алякун белагвардзейцаў, напалеон інтэрвэнцыі, люты вораг францускіх рабочых і сялян, душыцель кампартыі, герой цёмных спраў Тард'е сходзіць з капітанскага мосьціка францускага імпэрыялізму. («Правда»).

Да маёвай масоўкі

Будзь гатоў да працы і абароны!

18 мая ў Менску на цэнтральным стадыёне праводзіцца пырокая палітычная масоўка рабочых калектываў фабрык і заводаў, усіх прадпрыемстваў і навучальных устаноў Менску з удзелам чырвонаармейскіх часьцей.

Лёзунг масоўкі—будзь гатоў да працы і абароны!

Даклад аб міжнародным становішчы СССР, аб тых задачах, якія стаяць перад працоўнымі Савецкага саюзу ў сувязі з узросшай пагрозай вайны; вялікі парад фізкультурнікаў; футбольны матч: Ленінград-Менск; масавыя гульні і інш.—такава праграма масоўкі. Акрамя таго, на тэрыторыі стадыёну будуць арганізаваны выстаўкі Асоавіяхіму, Аўтадору і таварыства Чырвонага крыжу.

Задача кожнага парткалектыву, кожнай парт'ячэйкі і партгрупы—зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу па падрыхтоўцы да 18 мая. Падрыхтоўка павінна праходзіць пад знакам яшчэ большай мабілізацыі рабочых і працоўных мас па барацьбу за генэральную лінію партыі—за тэмпы і якасьць у выкананьні вытворчых плянаў, за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны.

Ужо зараз рад партарганізацый менскіх прадпрыемстваў па-бальшавіцку ўключыліся ў падрыхтоўку да дня 18 мая. **На заводзе імя Варашылава** ва ўсіх цэхах і агрэгатах праводзяцца адпаведныя гутаркі, арганізован спэцыяльны штаб, які адказвае за правядзеньне ўсёй падрыхтоўчай работы па прадпрыемстве. На тэрыторыі заводу—шмат лёзунгаў, якія знаёмяць рабочых з задачамі і роляй масоўкі. Кіраўніцтва заводу прыступіла да арганізацыі паходнага буфэту, які будзе абслугоўваць удзельнікаў масоўкі на стадыёне. Прыняты ўсе захады для таго, каб забясьпечыць арганізаваны і сваячасовы прыход на стадыён усяго рабочага калектыву.

Аналёгічная работа праводзіцца на фабрыцы «Камунарка», абутковай і інш.

Зусім інакш аднесьліся да гэтай справы кіраўнікі партарганізацыі заводу «Камунар». Яшчэ да гэтага часу сакратары партыйных ячэек жасьцянага і мэханічна-зборачнага цэхаў нават ня ведаюць аб масоўцы. Бюро парткалектыву нічога не зрабіла для таго, каб сярод рабочых стварыць належную грамадзкую думку па гэтым пытаньні.

Гэтыя факты сыгналізуюць аб тым, што паасобнымі бюро парткалектываў і ячэек справа падрыхтоўкі да масоўкі яўна недаацэнена.

Не зацягваючы справы ні на хвіліну ўсе нізавыя партарганізацыі Менску павінны распачаць масавую падрыхтоўку да 18 мая, паставіўшы перад сабой задачу:

— Кожны вольны ад работы на прадпрыемстве працоўны—удзельнік маёвай масоўкі. К.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Пачынаецца пабудова другой магнітагорскай плаціны

МАГНІТАГОРСК. У гэтым годзе першая магнітагорская плаціна ўпяршыню вытрымала мацнейшую паводку з ледаходам. Гэта выпрабаваньне плаціна вытрымала бліскуча. Зробленае пасьля паводкі дакладнае абсьледваньне паказала абсалютную адсутнасьць якіх - небудзь пашкоджаньняў, як жалеза - бэтоннай кладкі, так і каменнай накідкі.

Вопыт першай плаціны, які выхаваў асноўныя кадры магнітагорскіх будаўнікоў, неабходна перанесьці на будаўніцтва другой плаціны.

Канчаткова праект апошняй ужо зацьверджан. Асноўныя будаўнічыя работы павінны быць скончаны ўвосені 1933 году.

Возера, якое будзе створана другой плаціной, дасягне 35 кв. клм. (возера, створанае першай, дасягае 14 кв. клм.)

Акрамя задаваленьня патрэб заводу, возера адыграе вялікую ролю ў справе зьмягчэньня кліматычных умоў сацыяналістычнага гораду.

Кабель з алюміневага сплаву

ЛЕНІНГРАД. Ленінградзкі завод «Сев кабель» выпусьціў першыя пробныя 130 мэтраў кабелю з алюміневага сплаву. Кабель адзначаецца высокай трываласьцю і лёгкасьцю і прызначан для перадачы тону высокага напружаньня.

Выраб савецкіх целявізораў

Ленінградзкі завод «Камінтэрн» пры ступіў да вырабу першых 20 савецкіх целявізораў (апарат па перадачы малюнкаў па радыё). Целявізоры «Кам інтэрну» могуць ня толькі перадаваць малюнкі прамоўцаў ці артыстаў, але і балетныя нумары і кінофільмы.

Выпуск падшыпнікаў

Першы дзяржаўны падшыпнікавы завод імя Кагановіча (Масква) за першую дэкаду мая выпусьціў 9.043 шт. падшыпнікаў.

Будматар'ялы

Лесазавод **«Калектыўная праца»** Гомельскага камбінату за першую дэкаду мая расьпілаваў 2.166 к. м. сыр-пу, што складае 88,8 проц. пляну.

***

Завод «Інтэрнацыянал» за 9 мая выпрацаваў 200,4 кгр. цьвікоў, што складае 65,8 проц. сутачнага заданьня і 886,9 кгр. шрубаў—91,8 проц. За 10 мая выпрацавана 132 кгр. цьвікоў — 39,2 проц. і 925,9 кгр. шрубаў—100,1 проц.

***

Завод «Чырвоны Кастрычнік» за першую дэкаду мая выпусьціў прадукцыі на 28.542 руб., што складае 12,9 проц. месячнага пляну; у тым ліку цьвікоў будаўнічых выраблена 43,5 тоны — 25,3 проц. заданьня.

Параўнальна з першай дэкадай красавіка, ёсьць нязначны зрух. Так, за першую дэкаду, красавіка месячны плян быў выкана усяго на 9,3 проц., а за першую дэкаду мая — на 12,9 проц.

НА ЗДЫМКУ: партыя першых падшыпнікаў з савецкіх матар'ялаў. Маскоўскага дзяржаўнага заводу імя Кагановіча. «СКФ» БОЛЬШ НЯМА, ЁСЬЦЬ «ГПЗ».

Цукар з клёну

Беларускі навукова - дасьледчы інстытут распрацоўвае пытаньне аб здабычы цукру з клёнавага соку.

Сок выцякае з клёну ад 25 да 30 дзён у год; за гэты тэрмін адно дрэва дае 27,5 літраў соку, з якога можна здабыць 550 грам цукру і 240 грам патакі.

Вялікая колькасьць клёну на Беларусі дае новую базу сырцу для здабычы цукру. Неабходна ў сэзон 1933 году паставіць вопыт здабычы цукру з клёнавага соку ў прамысловым маштабе. Ф. К. і І. Р.

На менскай электрастанцыі

Менская электрастанцыя ў першай дэкадзе мая здала тэмпы выпрацоўкі электраэнэргіі. Так, у трэцяй дэкадзе красавіка было выпрацавана 783.216 квт-гадзін, што складала 102,16 проц. пляну, а за першую дэкаду мая выпрацавана толькі 668.523 квт. - гадзіны — 94,2 проц.

Абутак

За 10 мая гомельская абутковая фабрыка «Праца» выканала сутачнае заданьне на 113,6 проц. Выпушчана абутку: хлапчуковага (вырраст) 839 пар, што складае 145,9 проц. пляну, ботаў—1.377 пар—129,3 проц. пляну, абутку хлапчуковага (яловага) — 548 пар — 104,3 проц. і абутку мужчынскага — 918 пар — 85,4 проц. Усяго выпрацавана 3.682 пары абутку.

Вопратка

Чырвонасьцяжная фабрыка «Кастрычнік» за другую пяцідзеўку мая выпусьціла 15.802 польтаў на суму 556.000 руб., што складае 107,6 проц. заданьня.

***

Швэйная фабрыка **імя 8 сакавіка** за другую пяцідзеўку мая дала прадукцыі на 158.000 руб., што складае 101 проц. пляну.

У ЭКАНАМІЧНЫМ САВЕЦЕ БССР

Эканамічны савет адзначыў, што з боку аб'яднаньня Будматар'ял і заводакіраўніцтва ня зьвернута ніякай увагі на паляпшэньне якасьці труб, якія выпускаюцца копыскім заводам. Запрапанавана аб'яднаньню Будматар'ял заключыць дагавор з інстытутам прамысловасьці, паладзіць аналіз труб, якія вырабляюцца з копыскай і чавускай гліны.

Эканамічны савет абавязаў інстытут прамысловасьці работу па выяўленьні годнасьці копыскай гліны для вытворчасьці керамічных труб скончыць да 25 мая г. г. Аб'яднаньне Будматар'ял кавіша да 15 мая ўстанавіць эканамічную мэтазгоднасьць завозу чавускай гліны ў Копысь і склесьці калькуляцыю кошту аднэй тоны труб з чавускай гліны, якая завозіцца. Запрапанавана аб'яднаньню Будматар'ял заключыць дагавор з Вадаканалтрэстам аб водпуску ўсіх керамічных труб, якія вырабляюцца копыскім заводам. Даручана стандартнаму камітэту правесьці кантрольнае абсьледваньне стандарту керамічных труб, якія выпускаюцца копыскім заводам.

Зьнішчыць непаладкі ў будыніку Менгартэатру

Яшчэ 18 жніўня 1931 году мясцком менгартэатру адзначыў у сваёй пастанове неабходнасьць паляпшэньня тэатральнай прадукцыі. Але-ж гэту пастанову ігнаруе адміністратар Савінкаў. Ён груба адносіцца да работнікаў тэатру. З-за нядбайнасьці Савінкава часта зрываліся пастаноўкі опэры, яўрэйскага дзяржаўнага тэатру, беларускай дзяржаўнай студыі. Савінкаў замест таго, каб лепш падрыхтавацца да пастаноўкі, п'янствааў. Арганізацыя рабочага глядача адсутнічае.

У студзені 1932 году была выяўлена растрата ў 1.200 руб. Дырэктар Савінкаў абвінавачваў бухгальтэрыю, а бухгальтэрыя — адміністрацыю. Справа была перадана ў суд. Праз некаторы час была выяўлена другая растрата ў 358 руб. і ніхто ня можа вырашыць, хто вінаваты ў гэтым. Неабходна мясцкому і парт'ячэйцы ва што-б там ні стала ўздаравіць работу менгартэатру. Рабкор К.

Папраўка

У перадавым артыкуле «Шырокі ўдзел працетарскай грамадзкасьці — асноўная ўмова посьпеху лесасплаву» («Зьвязда» ад 14 мая 1932 г.) дапушчана памылка: надрукавана—«158 сталовак», трэба чытаць—«58 сталовак».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Рэдакцыя газэты „Зьвязда" і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня склікаюць на 18 мая, у 7 гадз. вечара

нараду загадчыкаў сталовых г. Менску па пытаньні аб трусагадоўлі

Нарада заслухае даклад дырэктара Менскага трэсту грамадзкага харчаваньня т. Турецкага аб вызначаных у гэтай галіне мерапрыемствах і абгаворыць практычныя пытаньні трусагадоўлі пры сталоўках.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі сталовых: ЖАКТУ № 6—тав. ЛЮСТЭРНІК і аматар - трусавод БУГАЕВА. З БЕЛКААПСАЮЗУ—спэцыяліст ВІНАГРАДАЎ, з БЕЛТРУСАВОДТРЭСТУ—т. ГАЛУБЧЫК, з КАЛГАСЦЭНТРУ—т. БАГУШЭЎСКІ, загадчыкі сталовых № 1—т. САГАЛОЎ, № 2—т. АКСЭЛЬРОД, № 3—т. ХАЗАН, № 4—ШАМЭС, № 5—РАГОЗІН, № 10—КРЫВАШЭЕЎ, № 11—Т. АСОБСКАЯ, № 12—т. ШУЛЬЦ, № 13—т. ФРЫДЛЯНД, № 14—т. ГУДЗІМАЎ, № 15—КАПЦЭВІЧ, № 16—ЯДГУР, № 19—ОЗДЭР, № 21—ФІШКІН, № 23—ВАЙТАСЕВІЧ, № 25—ГАДМАЕР, № 29—БЭРНШЭЙН, № 32—ПАПКОЎ, № 35—МАКСІМЕНКА, № 34—КІВОВІЧ, № 37—КАЗАК, № 40—ХОЦІН, № 41—МАЧАЛЬСКІ, № 43—БЯЗПРЫЗВАНЫ, № 44—ХАРЫТОНЧЫК, № 48—ВОЛЬПЭР, № 49 — МЭЛЬЦЭР, № 50—ШАРШУН, № 52—ШАТКОЎСКІ, № 57—НЕКРАШ, загадчыкі ўсіх сталовых ТСТ чыгуначнікаў, прадстаўнікі Белкаапхарчу, харчэнцы ТСТ чыгуначнікаў, усіх ЗРК і ЗВК.

Калі па якой-небудзь прычыне асобныя загадчыкі зьявіцца ня могуць, абавязкова прысутнасьць іх намесьнікаў.

Нарада адбудзецца ў габінэце рэдактара «Зьвязды» (Савецкая 63, 3-ці паверх).

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».
ЦП САЮЗУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ.

15 МАЯ
склікаецца **чарговы пленум**
ЦЭНТРАЛЬНАГА ПРАЎЛЕНЬНЯ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ БССР
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Вынікі сакавіцкага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.
2. Вынікі IX усесаюзнага зьезду прафсаюзаў і VIII усесаюзнага зьезду саюзу працасьветы.
3. Аб 2-м пяцігадовым пляне культурнага будаўніцтва.
4. Аб ходзе рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.
Пачатак Пленуму 15-V г. г. у 6 гадз. веч. у памяшк. Дому Асьветы.
Яўка старшынь МК, ГК саюзу працасьветы г. Менску обавязкова.
Запрашаюцца ўсе члены саюзу працасьветы.

19 мая, у 7 гадз. вечара, у Доме Камасьветы (былы клюб К. Маркса) Дзяржарбітражам пры СНК з удзелам грамадзкасьці
будуць разгледжаны спрэчкі
паміж выдавецтвамі „Зьвязда", „Савецкая Беларусь", ДВБ і Саюздрукам пры НК Сувязі
АБ НЕДАХОПАХ У РАСПАЎСЮДЖАНЬНІ газэт і часопісяй.
Запрашаюцца работнікі сувязі, выдавецтваў, упаўнаважаныя па друку на прадпрыемствах, рабкоры і чытачы газэт і часопісяй. Уваход вольны.
Дзяржарбітраж пры СНК.

20-га мая 1932 г., у 6 г. вечара, у гор. Менску, у клюбе харчавікоў імя Сталіна адкрываецца
3-ці ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД Т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ БССР.
ПАРАДАК ДНЯ ЗЬЕЗДУ НАСТУПНЫ:
1. Задачы Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу.
2. Справаздача ЦК Чырвонага Крыжу.
3. Справаздача рэвізыйнай камісіі т-ва Чырвонага Крыжу.
4. Выбары ЦК і рэвізыйнай камісіі т-ва Чырвонага Крыжу БССР.
5. Выбары дэлегатаў на ўсесаюзны зьезд т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу.
Прапануецца ўсім раённым Камітэтам Чырвонага Крыжу забясьпечыць сваячасовае прыбыцьцё дэлегатаў на зьезд.
Прэзыдыум ЦК Т-ва Чырвонага Крыжу БССР.

Інстытут завочнай тэхнічнай адукацыі „ВСНИТО"
КАМБІНАТЫ: рыхтуюць інжынэраў, тэхнікаў і чарцёжнікаў будаўнічай і мэханічнай спэцыяльнасьцей.
КУРСЫ: 1) Павышэньня кваліфікацыі інжынэраў, і тэхн. будаўн. і мэханічн. спэцыяльнасьцей. 2) Рабочай падрыхтоўкі ў ВТНУ і тэхнікум. 3) Грамадзка-палітычн. дысцыплін для ПТР.
Прыём заяў круглы год. Праспэкты, анкеты, кантрольныя работы высылаюцца па заатрабаваньні па 20 кап. за экз. маркамі.
МОСКВА, ИЛЬИНКА, ПРОЕЗД им. ВЛАДИМИРОВА, 6.
ДЫРЭКЦЫЯ „ИЗТО".

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ОПТЭ ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ
АПЭР.-ЭКС. СЭКТАР ЦС „ОПТЭ" АРГАНІЗУЕ
ПАДАРОЖЖЫ ПА УСІХ РАЁНАХ СССР ПА АБМЕНЕ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ
ПАМІЖ ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ,